ПАЛАЦАК

Выданьне беларускага культурна-
асьветніцкага цэнтру
Кліўленд
ЗША

№10 (30), 1993

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012



Кліўлендзкія Калядоўшчыкі 1963 г. (Фота зьверху)
Беларуская аркэстра г.Кліўленда, 1963 г.
Зьлева направа: Янка Яраховіч, Аляксандр Літвінка, Кастусь Калоша, Валодзя Літвінка, Міхась Яраховіч.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Polatsak

Published with the financial support of the parish
Mother of God of Zyrovicy, BAOC
Cleveland, Ohio, USA.

Editorial board: **Svetlana Belaia** (Editor-in-Chief), **Michael Bielamuk** (Secretary), Members -- **Yanka Chanenka, Olga Dubanevich (McDermott), Jan Solowianiuk**

Рэдакцыйная калегія: **Сьвятлана Белая** (Галоўны рэдактар), **Міхась Белямук** (сакратар), сябры — **Янка Ханенка, Вольга Дубаневіч (МакДэрмат), Янка Салавянюк.**

Ганаровыя сябры рэдкалегіі:
Рыгор Барадулін,Анатоль Белы, Васіль Быкаў, Георгій Штыхаў, Язэп Юхо.

Прозьвішчы падпішчыкаў і ахвярадаўцаў рэдакцыя будзе публікаваць у часопісе.

All correspondence should be addressed to:
S.Belaia or M.Bielamuk,
10915 Lake Rd., Cleveland, Oh. 44102, USA.
Tel. & Fax. (216) 651-3451

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Зьмест

Калядныя прывітаньні
Мітрапаліт Менскі і Слуцкі,Патрыяршы Экзарх усея Беларусі Філарэт. . . . 3
Пратаярэй а. Міхась Страпко. . . . 3
Васіль Быкаў. . . . 4
Адам Мальдзіс. . . . 4
Рыгор Барадулін. . . . 5
Аляксей Анішчык. . . . 6
Валеры Санько. . . . 6
Тацьцяна Каротчанкава. . . . 6
Анатоль Белы. . . . 7
Ганна Сурмач. . . . 7
Барыс Цімошчанка. . . . 8
Пятрусь Капчык. . . . 8
Ігар Пракаповіч. . . . 8
Самсон Самасуй. Навагодняя паэма. . . . 9
Грамадзкія арганізацыі Кліўленда. . . . 10

Пад бел-чырвона-белым сцьягам
Вадсім Круталевіч. Янка Купала і нацыянальна-дзяржаўнае адраджэньне. . . . 11

Наша гісторыя
Міхась Белямук. Тапаграфія знаходак манэт и аздобаў. . . . 16

З архіваў КДБ
Сьведчаньні Аркадзя Смоліча. . . . 20

Памяць зямлі
Янка Жамойцін. З перажытага. . . . 24

Згукі Бацькаўшчыны
І. Нікітчанка. Аб галоўных прычынах крызысу сельскай гаспадаркі ў Беларусі. . . . 30

Роднае слова
Міхась Кавыль. Із агню ды ў полымя. . . . 34
Марат Баскін. Ваўкалак. . . . 38
Лісты і вершы Уладзіміра Караткевіча. . . . 40
Валеры Санько. Хрышчэньне. . . . 46
Адам Мальдзіс. Пачатак музею «Беларусы ў сьвеце» пакладзены. . . . 50
Натальля Арсеньнева. Пётр Нядзьвецкі. У бой за Случчыну сваю. . . . 51

З жыцьця эмігрыцыі. . . . 53
Публікацыі часопіса «Полацак» за 1993 год. . . . 60

На развароце. Каляды ў Менску. Фота. Я. Коктыша
На першай бачынцы вокладкі **Васіль Вашчанка**.Нараджэньне Хрыста з «Асмагласьніка» 1730

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

У вялікае сьветаўратавальнае сьвята Раства Хрыстовага,
калі ўвесь сьвет цешыцца, што радзіўся Спасіцель і ў паднябесьсі зьвініць песьня

«Слава ва вышніх і на Зямлі мір, в челавеках благоволеніе»(Лк. 1, 14)

вітаю Вас з сьвятам благаволенія Божага за роду чалавечага.

Сардэчна жадаю Вам у Новым годзе вялікай і багатай міласьці ад народжанага Богадзіцяткі Хрыста й Яго благадатнай дапамогі ў Вашай вельмі карыснай працы ў выданьні часопісу «Полацак».

Ваш у Хрысьце:

† Філарэт

Мітрапаліт
Мінскі і Слуцкі,
Патрыяршы Экзарх
усея Беларусі.

Раства Хрыстова 1993/1994 Мінск

«Хрыстос Раждаецца!»

Гэты воклік захапленьня выходзіць з грудзей кожнага хрысьціяніна. Кожны ў гэты Сьвяты Вечар прагна чакае, што на зямлі запануе супакой, любоў, узаемапашана і спагадлівасьць.

Вітаю я Вас, дарагія, прыхажане Жыровіцкае Божае Маці з Раством Хрыстовым! Заклікаю супольна памаліцца і прасіць Дзіцятка, каб Беларусь захавала здабытую незалежнасьць, каб цяжкасьці эканамічныя беларускі народ пераадолеў, каб народ Беларусі загаварыў на беларускай мове.

Супрацоўнікам, аўтарам, чытачам часопіса «Полацка» зычу памысловасьці, посьпехаў, здароўя і Божай благадаці.

Пратаярэй а. Міхась Страпко

а. М. Страпко

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Чытачоў і працаўнікоў „Полацка" сардэчна віншую са сьвятымі Калядамі.

Хай вам шчасьціць за акіянам, на Беларусі і ва ўсім сьвеце, дзе жыве хоць адна беларуская душа.

Васіль Быкаў



Сябры Міжнароднага камітэта беларусістаў і супрацоўнікі Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Францішка Скарыны сардэчна віншуюць Вас з Калядамі і Новым годам і жадаюць у наступным годзе доўрага здароўя, шчасця і плёну ў працы!

Прэзідэнт МАБ,
дырэктар цэнтра

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Няма кладачкі...

Ну, вядома, што не забылася,
Не заелася хітрымі стравамі.
Зноў крывіцкае сэрца забілася
Ці ў Амэрыцы, ці ў Аўстраліі.
Прыгадала сьнягі сыпучыя,
І самое сябе засмучвае.

...Там на хрэсьбінах,
На запоінах
Ці завеі, ці йскрыпкі пілікаюць.
І ў лясах успамінаў замроеных
Цёпла выюць ваўкі ў піліпаўку.
Ах, Калядачкі,
Бліны-ладачкі!

Ды няма
Цераз мора кладачкі...

Рыгор Барадулін

Менск,
Сьнежань, 93

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Віленскае Згуртаваньне былых палітвязьняў-беларусаў шчыра вітае чытачоў і ўсю рэдакцыю «Полацка» з Калядамі і Новым 1994 годам!

Ад усяго сэрца жадаем Вам далейшых посьпехаў у плённай адраджэнцкай працы, асабліва ў выдавецкай дзейнасьці.

Шчасьця Вам! Няхай Усявышні дапаможа ўсім нам сваею апекай!

Жыве Беларусь!

Старшыня Згуртаваньня

LIETUVOS RESPUBLIKA VILNIAUS Baltarusių politinių kalinių ir tremtinių bendrija ВІЛЕНСКАЕ БЕЛАРУСКАЕ ЗГУРТАВАННЕ ПАЛІТЫЧНЫХ ВЯЗЬНЯЎ

(А. Акіянчык)

Беларускі дзіцячы фонд

БЕЛАРУСКАЕ ВЫДАВЕЦКАЕ ТАВАРЫСТВА «ХАТА»

220029, Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 31
Тэл.: 36-66-40, 62-38-86

Belarusan Children's Fund

BELARUSAN PUBLISHING HOUSE «KHATA»

Minsk, Belarus, 220029, 31, F. Scaryny, Ave.
tel.: 0 (0172) 36-66-40

Шаноўныя Гаспадары і Гаспадынькі!

Сардэчна віншуем калектыў беларускага часопіса «Полацак» ў далёкіх Злучаных Штатах Амэрыкі , аўтараў і спонсараў часопіса з Калядамі, Новым 1994 годам!

Дай Бог усім здароўя, посьпехаў, творчасьці. Няхай ня гінуць марна задумы, намеры, праца. Каб памагаў Беларус Беларусу, дзе-б не сустрэўся.

Ваш аўтар, ён-жа дырэктар БВТ «Хата»

В.А. Санько

Шаноўныя выдаўцы часопіса «Полацак»!

Шчыра вітаем Вас і сардэчна віншуем з нагоды Калядаў! Зычым Вам шчасьця і здароўя, плёну ў Вашай нялёгкай, але такой шляхетнай працы —няхай і найдалей спрыяе Вам Бог у Вашых справах!

Вельмі дзякуем Вам за тое, што не забываеце Вільню—мы атрымліваем усе нумары часопіса. І мы вельмі ўдзячныя за цудоўную мажлівасьць больш даведацца аб жыцьці беларускай эміграцыі. Спадзяемся, што зможам калі-небудзь вітаць Вас у Вільні. Памятайце, што мы заўжды будзем радыя Вам.

Дасылаем таксама найлепшыя пажаданьні ўсім супрацоўнікам «Полацка», Вашым сябрам і блізкім—зычым Вам вясёлых Калядаў!

З павагай—Тацьцяна Каротчанкава, а таксама супрацоўнікі катэдры беларусазнаўства і студэнты Віленскага унівэрсытэту.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Шаноўныя суродзічы!

Сябры Менскага грамадзка-асьветніцкага клюбу «Спадчына» шчыра вітаюць Вас з Калядамі і Новым годам!

Ужо некалькі гадоў наш народ свабодна сьвяткуе Каляды. Мы рады, што сьвяткуем іх сумесна з Вамі, з усімі свабодалюбівымі народамі сьвету! Але нашаму народу вельмі цяжка, бо яшчэ шмат ворагаў на яго шляху, якія хочуць прыпыніць наш рух да адраджэньня.

Толькі мы перакананыя, што пераможам цяжкасьці, што вынесьлі на сваіх пакутлівых плячох лепшыя прадстаўнікі і патрыёты Беларусі, што разам з Вамі дачакаемся сьветлай будучыні для нашай Радзімы.

Дык будзем-жа супольна адзначаць Каляды з надзеяй на лепшую долю кожнага з нас, зь верай у ўваскрашэньне нашай любай Бацькаўшчыны.

Жадаем Вам весела адзначыць сьвяты і заўжды помніць, што Бацькаўшчына ў нас адна і часопіс «Полацак», у якім супрацоўнічаем Вы і мы, таксама адзін.

З павагаю і лепшымі зычэньнямі ў Новым 1994 годзе

Анатоль Белы.

Старшыня клюбу «Спадчына» Анатоль Белы

Шаноўнае спадарства!

Шчыра віншуем Вас і Вашыя сем'і з сьвятамі Нараджэньня Хрыстова і Новым 1994 годам!

Жадаем усім добрага здароўя, асабістага шчасьця і посьпехаў у адзінай для ўсіх нас высакароднай справе—адраджэньня нашай роднай Беларусі!

Зь вялікай павагай,

Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына»

Г. Сурмач

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Б Е Л А Р У С К А Е
нацыянальна-культурнае таварыства ім.Ф.Скарыны
"Белая Русь"

р/р 700220 "Промінвестбанк" г. Львоў 290020 г. Львоў вул. П.Панча 10/30
тел. 52-22-02

Шаноўныя сябры рэдкалегіі «Полацак»!

Віншую Вас з Калядамі і Новым годам!

Перш найперш шчыра дзякую за атрыманьне часопіса «Полацак». Зь вялікай цікавасьцю, больш таго з радасьцю адчуваем, што і далёка-далёка ў Амэрыцы жыве Беларусь!

Вельмі ўдзячны Вам за Вашую працу. Нашае згуртаваньне беларусаў Львоўшчыны зь вялікай павагай будзе карыстацца вашым выданьнем у сваёй дзейнасьці. Так, у нашай пастаяннай радыёпраграме «Вескі зь Беларусі» мы ўвялі цыкл «Наша гісторыя» і спадзяёмся, Ваш часопіс у гэтым нам дапаможа.

З павагаю Барыс Цімошчанка.

Львоў, Украіна.

Шаноўныя выдаўцы часопіса «Полацак»!

Віншую вас з Новым 1994 годам! Жадаю Вам моцнага здароўя, шчасьця, вялікіх посьпехаў у выдавецкай справе! Вялікі дзякую за часопіс «Полацак», які мы атрымоўваем рэгулярна. Прыміце найлепшыя пажаданьні са сьвятамі ад беларусаў Ізяслава.

Жыве Беларусь!

З павагай —Пятрусь Капчык.

г. Ізяслаў, Украіна.

Шаноўныя выдаўцы часопіса «Полацак«!

Шчырыя прывітаньні з Нарачанскага краю!

Пішу Вам ліст, каб падзякаваць за тыя нуамры часопіса «Полацак», якія Вы даслалі на мой адрас. Сапраўды, Ваш часопіс цікавы і карысны. Кажучы шчыра, ня толькі я чытаю Ваш часопіс, але і сябры нашага літаб' яднаньня, і мае калегі на працы (вядома, тыя ,хто зьяўляецца прыхільнікам адраджэньня Беларусі).

На разьвітаньне хачу пажадаць Вам усяго найлепшага, а галоўнае —моцнага здароўя і плёну ў працы.

Вясёлых Вам Калядаў і шчасьлівага Новага1994 Году!

З павагай,

Пракаповіч Ігар.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Навагодняя паэма

Самсон Самасуй

Заклумлены навалам асабістых спраў,
даўно я ў «Полацку» не выступаў.
А хто, спытаеце, я ёсьць?—
Ды Вам ужо знаёмы госьць:
пра аўтараў во гэтага выданьня
я змайстраваў было шчэ неяк да сьняданьня
паэму, гэта год таму назад,
яе з Вас кожны прачытаць быў рад.

Канешне-ж маё дела знай—малюй, рысуй,
Самсон, браткі, я ды яшчэ і Самасуй.
Хоць я ня суну ўсюды свайго носу,
ды часам я люблю даць чосу
якому-небудзь спрытнаму балбесу,
а так—тут паўтару—нікуды я ня лезу.
Я толькі па Самсону Самасую
становішча як кольвек абрысую,
што назіраем мы і тут, і ў Беларусі—
пра гэта кожны ведаць мусіць.

Каб не залазіць надта ў хмыз,
кароткім будзе мой абрыс.
З чаго пачаць?
Не дзеля нейкай ветлівóсьці
сказаць пра часопіс мы мусім штосьці,
пра «Полацак», што, зухаваты,
праз акіян перасяліўся ажно ў Штаты
і нумар цісне тут ужо трыццаты.

Ну як не прасьпяваць яму тут мімаходам:
«Здароў будзь, браце! З Новым годам!
Сьпялі свой залацісты ўраджай.
Старонкі свае, колькі моцы ашчаджай.
Для думак, а глыбокіх, паўнакроўных,
для непаўторных вобразаў, чароўных.
Дастойным будзь, вялікага імя
і вобразу сьвятой Сафіі».

Наперад поступу ўжо ня суняць.
Падмурак ня скрышыць стыхіям.
Аднак, на вуха табе хоча Самасуй
шапнуць, што ёсьць ў цябе і супернікі
Дык ты глядзі,ня збоч, вяслуй —
Супернікі не пачастуюць пернікам.

Зь дзяржаўніцкай вунь вышыні
Наш «Беларус» глязіць на цябе скоса.
Браток, пільнуйся, не зяўні—
ён на тых «мяст» цябе падкосіць.

А з флангу можа ўбрыкнуць
цябе яшчэ і «Беларускі дайджэст».
Ды так—разумным будзь—
што да сябе ты ня дайдзеш.

Ат, што я гавару? Павер
мінулай варажнечы ўжо няма і званьня.
І, слава Богу, што цяпер прыйшлі мы ўсе да
мірнага суіснаваньня.

Запанавала згода, нат шкада,
што ўжо няма ранейшай перапалкі.
Арэна апусьцела, як мёртвая вада,
стаіць без выступленьняў палкіх.

А там на Бацькаўшчыне тож
не раскачаюцца ніяк.
Падумаешь, і кіне ў дрож—
найбольш актыўны там паляк.

Ды ты, мой братка, ня сумуй—
«тутэйшы» не такі ўжо лайдак.
Пацешыць цябе хоча Самасуй—
На варце ў нас стаіць Зянон Пазьняк

1993 г.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

З Калядамі !

Кліўлендзкі аддзел БАЗА,

Культурна-асьветніцкі цэнтр «Полацак»,

Беларуска-Амэрыканскія ветэраны

Згуртаваньне беларускіх жанчын

часопіс «Полацак»,

З Новым 1994 годам!

Сардэчна віншуюць кожную беларускую
сямейку з Новым годам і Калядамі!
Зычым усім здароўя, посьпехаў
і памыснасьці!
Няхай радасьць і шчасьце
будзе ў кожнай сям'і!!!

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Пад бел-чырвона-белым сцягам

Янка Купала і нацыянальна-дзяржаўнае адраджэньне

Вадзім Круталевіч

Ня менш красамоўна на карысьць незалежнасьці Беларусі гаворыць і яе гісторыя *«Беларуская дзяржаўнасьць,*—піша Купала,— *існавала ў мінулым. Гэта было Вялікае Літоўска-Беларускае княства».* Дарэчы, у нашы дні радыкальна настроеныя гісторыкі схільны выключыць з назвы княства напамінак пра Літву. Ці ёсьць для гэтага падставы? Толькі глыбокія, рознаплянавыя дасьледаваньні могуць праясьніць характар палітычнай арганізацыі і дамінуючых кіруючых сіл ў поліэтнічнай дзяржаве, на працягу стагодзьдзяў да таго-ж мяняўшай сваю тэрытарыяльную канфігурацыю.

Паэт сьцвярджаў, што *«беларуская культура высока трымала свой сьцяг у родным краі»* [9]. Але становішча беларусаў карэнным чынам стала мяняцца з уступленьнем Вялікага княства Літоўскага ва унію з Польшчай. Беларуская культура стала выцясьняцца «польскім панаваньнем».Маёмасныя клясы грамадзтва «за бліск золата ідуць к дужым» і ў імя сваіх карысьлівых мэт здраджваюць інтарэсам народу. Тлумачачы гэтую думку, Купала дае наступную характарыстыку фэўдальнай вярхушцы: *«беларускае баярства за польскія шляхецкія значкі і цеплыя каля трону месцы, пачало выракацца ўсяго свайго роднага беларускага і перакулівацца на старану чужую, польскую. Забылося баярства на звычай і обычай беларускі, на сваю гісторыю, мову, літаратуру, дзе больш званілі золатам, там вышэйшыя станы тагачаснага грамадзянства і служылі, і прадавалі сябе, свой народ, сваю бацькаўшчыну»* [10] Як вынік усёй гэтай эвалюцыі сяляне засталіся беларусамі, а вышэйшыя класы, баярства ператварыліся ў палякаў. Ня толькі маёмаснае, сацыяльнае становішча, але і нацыянальныя асаблівасьці падзялілі сялян і памешчыка. *«Двор глядзіць на селяніна, як на «люд рускі», як на быдла, над каторым можна толькі стаяць з бізуном эканомскім, а вёска глядзіць на пана як на прыблуду з чужацкай стараны ,які захапіў его, селяніна, землю, ды яшчэ зьдзекуецца над ім самім».* [11]

У кантэксьце аналізу перадумоў утварэньня беларускай дзяржаўнасьці Купала закранае гісторыю нацыянальнага руху, ролі Беларускай сацыялістычнай Грамады, газэты «Наша ніва». Ужо само па сабе зьяўленьне БСГ, як і выданьне «Нашай нівы» ва ўмовах тагачаснай расейскай рэчаіснасьці было выяўленьнем пратэсту супраць няроўнапраўнага становішча беларусаў. Ужо сваім зьяўленьнем гэтыя нацыянальныя інстытуты адхілялі афіцыяльную канцэпцыю аб несамастойнасьці беларусаў як нацыі, а значыць яе культуры, мовы, звычаяў.

Рух,які спрабавала ўзначаліць БСГ, калі мець на ўвазе яго агульнасацыяльную аснову, як вядома, не выходзіў за рамкі традыцыйных дэмакратычных патрабаваньняў. Прытрымліваючыся сваіх уяўленьняў аб значэньні нацыянальнага ў грамадзкім

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

жыцьці, Купала ўсё-ж схільны перабольшваць ролю БСГ і «Нашай нівы» як фактараў нацыянальна-вызваленчага руху: «*Моцны падмур быў зроблены, трэба было толькі класьці сьцены і завяршыць будову сьветлага незалежнага існаваньня Беларускай дзяржавы*».[12] Вопыт пакажа, што ўсяго гэтага было недастаткова. Трэба было яшчэ, каб нацыянальна-адраджэнскія ідэі захапіла масы ,каб высокага ўзроўню дасягнула нацыянальная самасьвядомасьць народу. І сам Купала адзначае, што фарміраваньне нацыянальнай самасьвядомасьці перашкаджаюць забабоны аб несамастойнасьці беларусаў як нацыі, што ўкараніліся ў грамадскай думцы. «*А вось загаварыце вы аб беларускай незалежнасьці... Тут вам цэлую кучу нагавораць усялякіх перашкод, недарэчнасьцяў, што аж вушы вянуць слухаючы,—абураецца Купала. —На ўсякую іншую незалежнасьць кожны з вамі згодзіцца, абы толькі не на беларускую*»[13]

Разглядаючы перадумовы ўтварэньня самастойнай беларускай дзяржавы, Купала выказвае таксама сваё меркаваньне аб уплыве на лёс Беларусі руска-польскіх адносін. Сутыкненьне інтарэсаў Польшчы і Расеі, ставіла Беларусь у становішча аб'екта гісторыі, выключала яе самастойнае дзяржаўнае існаваньне. І вынікам такой сітуацыі мог быць ці падзел Беларусі, ці гвалтоўнае далучэньне да адной змагаючыхся дзяржаваў. Сыходзячы з вопыту гісторыі, Купала прыходзіць да вываду: «*Наша незалежнасьць сольлю ўвочу для незалежнасьці нашых суседак Польшчы і Расеі, бо адна і другая хацелі-б нашу незалежнасьць утапіць у лыжцы вады сваёй незалежнасьці. Для адбудаваньня вялікай Польшчы: «ад мора да мора» трэба пераступіць Беларусь, для адбудаванньня вялікай Расеі ад Белага да Чорнага мора трэба растаптаць Беларусь*»[14].

Палітыка Польшчы і Расеі ў адносінах да Беларусі, на думку Купалы, гэта праяўленьне больш агульных заканамернасьцей. Барацьба прыгнечаных нацыяў за сваё вызваленьне заўсёды сустракала жорсткае супраціўленьне дзяржаваў, праводзіўшых імпэрыялістычную палітыку. Гісторыя дала нямала прыкладаў таго, як вялікія дзяржаўныя нацыі ў барацьбе за падзел сьвету і сфэры ўплывў рознымі спосабамі, і перш за ўсё насільлем, падпарадкоўвалі сабе адставаўшыя ў сваім эканамічным, культурным і палітычным разьвіцьці народы. Іх лёс падзяліла і Беларусь.

Англія, Нямеччына, Японія й іншыя дзяржавы, адзначае Купала, «*у сваім імпэрыялістычным і мілітарным усезначаючым паходзе мелі адну ярка зарысованую мэту—гэта грабіць як найболей свае каршуновае крыло чужых малых народаў і падняволіць іх сваёй нацыі, сваяму дзяржаўнаму правапарадку*[15].Прыгнятаючы падпарадкаваныя народы, імпэрыялістычныя дзяржавы насільна навязвалі і свой лад жыцьця, а разам з гэтым падаўлялі нацыянальныя асаблівасьці пакораных народаў.

Імкненьне да захопу чужых тэрыторыяў і багацьцяў параджала канфлікты. Сусьветная вайна 1914—1918 гг. закончылася перадзелам сьвету, падзелам калоніяў і сфэр уплываў. «*Абвешчаныя буржуазнымі рэвалюцыямі прынцыпы свабоды і роўнасьці і брацтва бессаромна парушыліся «Мацьнейшыя народы,—пісаў Купала,—хочуць павялічыць сваю тэрытарыяльную і збройную сілу коштам слабейшых. Слабейшыя народы, асабліва ўваскрослыя на тэрыторыі быўшай Расеі, змагаюцца толькі за тое, каб жыць, каб адстаяць сваю незалежнасьць, не упускаючы свайго і не захапліваючы чужога*». [16]

Аналізуючы гістарычны вопыт, Купала

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

прыходзіць да вываду, што ўсякая дзяржава, якая робіць замах на свабоду, незалежнасьць і землі іншага народа, ніколі ня будзе спрыяць насельніцтву захопленых тэрыторыяў,якімі-б прыгожымі словамі, пажаданьнямі й абяцаньнямі гэта не прыкрывалася. Каланіяльны разбой, нацыянальны прыгнёт усё гэта знаходзілася ў незвычайнай супярэчнасьці з фармальна абвешчанымі буржуазнымі рэвалюцыямі, высокімі прынцыпамі свабоды, роўнасьці,брацтва. [17]

У рэзкай выкрывальніцкай форме Купала крытыкуе сілы, што развязалі сусьветную бойню.Пераможцы ў сусьветай вайне, краіны Антанты, на міжнароднай канфэрэнцыі ў Парыжы перакройвалі карту сьвету, дзялілі калоніі, устанаўлівалі сфэры ўплыву і г.д. На гэтым ганебным «торжышчы» малыя народы былі разменнай манэтай у палітычнай гульні імпэрыялістычных краін. [18] Менавіта «антанты» і«супрацьантанты» мілі-тарызм «*для панаваньня ўсясільнага молахазолата» ўцягнулі народы ў бездань вайны*». 19

У артыкуле «Адбудова Беларусі» Купала прапаноўвае стварыць спэцыяльную камісію, якая-б «*аб'ехала й абследавала найболей зьніштожаныя месцы, падлічыла ўсе страты і падала рахунак*»[20]. Дасьледваньні камісіі павінны былі стаць вядомымі сусьветнай грамадзкасьці, даведзены да ведама заходніх урадаў, узяўшых на сябе ролю наладжвальнікаў пасьляваеннага міжнародна-прававога парадку.

Выразнымі штрыхамі паэт малюе жахлівую карціну, выкліканых вайной у Беларусі разбурэньняў, небывалага ўпадку вытворчых сіл, зьбядненьня і голаду. У гэтым сэньсе артыкул мае значэньне дакумэнтальнага сьведчаньня. Асабліва спустошана была паласа ад возера Нарач да Пінска, дзе ў 1916 г. спыніўся фронт імпэрыялістычнай вайны. У названым артыкуле чытаем: «*Цэлы сьвет ведае, што самыя крывавыя бітвы, самае дзікае зьніштажэньне людзей і іх дабра ў гэту вайну—было на Беларусі. Досыць зірнуць толькі вокам на старую лінію нямецка-расейскіх акопаў, каб пабачыць якога жудаснага разбурэньня на сотні квадратных міль даканала чалавечая рука—яе лапата, як гарматні пярун. Людзі варочаюцца да сваіх хат, не знаходзяць іх, шукаюць сваіх гоняў, а іх не відаць: гарматнія стрэлы зьняслі з вобліку зямлі хаты, зьніштожылі межы і гранічныя слупы.*

І Беларусь жабруе!

З-пад Смаргоні, з-пад Маладэчна, з-пад Крывічоў, і г.д. і г.д. абарваныя, галодныя людзі ходзяць па сваёй бацькаўшчыне і па чужынцах і просяць...» [21]

Сэнс публікацыі аднак больш глыбокі, чым зьмешчаныя ў ёй прапановы аб стварэньні камісіі аб панесеных стратах. Купала і ня мае якіх-небудзь ілюзіяў адносна таго, што урады,якія разьвязалі сусьветную вайну, прыдуць на дапамогу беларускаму народу «*дзеля яго адбудаваньня, дзеля яго ратаваньня ад галоднай і халоднай смерці*». [22] Паэт якраз ставіць пытаньне аб міжнароднай адказнасьці за разьвязаную сусьветную бойню,і за «страшэннае зьніштажэньне» людзей і маёмасьці. Артыкул гучыць як гнеўнае выкрыцьцё тых, хто ўвернуў народы ў бездань сусьветнай вайны, якая прынесла народам незьлічоныя бедствы,

Купала верыць у магчымасьць раўнапраўных, нават брацкіх адносін паміж народамі.І ў гэтай сувязі ён выказвае свае меркаваньні аб тым, як павінны быць пабудаваны міжнацыянальныя адносіны, калі ў Беларусі будзе створана незалежная дзяржава.Ён сыходзіць з таго (і гэта галоўная пасылка), што народ, які зьведаў прыгнёт, будзе са спачуваньнем, з разумень-

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

нем ставіцца да прадстанікоў іншых нацыяў, якія жывуць разам зь ім у межах адзінай дзяржавы.

«*Тыя шчыра-дэмакратычныя думкі, лунаючыя яснымі краскамі на цэлым сьвеце, аб волі, роўнасьці, братачнасьці,*—піша Купала,— *бадай, наглыбей запалі і западаюць у нашы гаротныя душы і сэрцы*»[23] Ён лічыць, што вольны беларус, які атрымаў сваю дзяржаўнасьць, у сваёй незалежнай дзяржаве, будзе «*куды прыхільней адносіцца да іх* (нацыянальных меншасьцей— В.К.) *чымся беларус, падняволены чужынцам*».[24]

Такім чынам, Купала прытрымліваецца глыбока дэмакратычных поглядаў на асновы адносін паміж народамі ў адной дзяржаве.Вырашэньне «балючага пытаньня», на яго думку, павінна ажыцьцяўляцца на шляхах юрыдычнага і фактычнага раўнапраўя нацыянальнасьцей. Галоўны пачатак, на якім павінны будавацца міжнацыянальныя адносіны, заключаецца ў тым, што ўсе грамадзяне дзяржавы, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасьці, павінны быць роўныя перад законам і перад дзяржаўнай уладай, вольна разьвіваць сваю культуру і самабытнасьць, кіруючыся пры гэтым мэтамі дасягненьня дабрабыту агульнай бацькаўшчыны—Беларусі[25]. Ва ўстановах улады нацыянальныя меншасьці павінны былі мець прапарцыянальнае прадстаўніцтва

Гэтыя глыбока дэмакратычныя ідэі сугучныя з палажэньнямі прынятага 11 лістапада 1992 г. закона «Аб нацыянальных меншасьцях у Рэспубліцы Беларусь».

Паэт асабліва ўважлівы да таго, што прадпрымалі савецкія ўлады ў Беларусі ў галіне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Адзін час яму здавалася, што «*беларуская справа становіцца на добры дэмакратычны грунт*» [26]. У час нямецкай акупацыі Купала жыў у Смаленску, і, значыць, мог непасрэдна назіраць за ходам падзеяў, сачыць за прэсай, супастаўляць дэкларацыі зь дзеяньнямі ўлад. Шэраг мер, якія прымаліся ў культурнай галне, Купала ўспрымаў зь яўным спачуваньнем і разуменьнем, напрыклад, падрыхтоўку да выданьня літаратурных твораў на беларускай мове, заснаваньне нацыянальнага аддзелу пры Выканкоме Заходняй вобласці.

Адносіны паміж народамі, якія ўсталёвала Савецкая ўлада, Купала вымяраў крытэрыямі вольнага разьвіцьця нацыяў. Аналізуючы практыку, ён пераконваецца ў неадпаведнасьці яе дэкларацыям і прававым актам. Адсюль сумненьні, што ствараемы бальшавікамі рэжым карэнным чынам зьменіць адносіны паміж народамі ,што вялікая дзяржаўная руская нацыя ў новых гістарычных умовах зробіць усё магчымае, каб дапамагчы палітычнаму, эканамічнаму і культурнаму адраджэньню раней прыгнечаных народаў.

Крытычна ацэньваючы праводзімую Аблвыканзахам у 1918 г. нацыянальную палітыку, Купала прыходзіў да вываду, што «*смаленскія обласныя камісары змагаліся з усялякімі, нават бальшавіцкімі праявамі беларушчыны*»[27]. Вайна супраць Беларускага нацыянальнага камісарыята, ліквідацыя аддзелу па справах нацыянальнасьцей пры Аблвыканкамзаху, забарона выданьня газеты «Рунь» і іншыя факты сапраўды давалі падставы для такога вываду.

На I зьезьдзе КП(б)Б у канцы снежня 1918 г. было афіцыйна заяўлена, што Беларуская савецкая рэспубліка абвешчаецца не ў сілу ўнутраных патрэбаў разьвіцьця савецкага ладу, ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі, а па меркаваньнях зьнешнепалітычнага парадку. Падобныя-ж ідэі выказваліся і на першым Усебеларускім зьезьдзе Саветаў (2-3 лютага 1919 г.). Газэта «Звезда», орган

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Цэнтральнага Бюро КП(б)Б, падводзячы вынікі працы зьезда, адзначала, што неабходнасьць існаваньня Беларусі як самастойнай палітычнай адзінкі абумовілі «*прычыны міжнародна-палітычнага характару*» [28].

Газэта ў той жа час кляйміла «Спробы беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі да стварэньня «сваёй» беларускай мовы, «сваёй» нацыянальнай культуры й інш.

Абвяшчаецца нацыянальная рэспубліка, а яе партыйнае кіраўніцтва тут-жа накладавае табу на выпуск беларускамоўнай газэты—прадаўжальніцы «Дзяньніцы», якая ў 1918 г. выдавалася у Маскве. Дарэчы, у Менску ў сьнежні 1918 г.—жніўні 1919 г., г. зн. калі ў горадзе дзейнічала Савецкая ўлада, так і не быў наладжаны выпуск беларускай савецкай газэты, якая магла-б стаць цэнтрам прыцягненьня лаяльна настроенай і вагаючайся беларускай інтэлігенцыі—пісьменьнікаў, паэтаў, публіцыстаў, вучоных і інш. Прымаецца Канстытуцыя, а ў ёй ні слова аб нацыянальным адраджэньні. Абвяшчаецца БССР, а праз два тыдні ў Маскве прымаецца рашэньне аб скарачэньні яе тэрыторыі да дзвюх губерняў. З урада рэспублікі выганяюцца беларусы. Рэспублікай кіруюць тыя, хто выступаў супраць яе стварэньня.

Несумненна, усё гэта крайне адмоўна ўспрымалася Купалам. Па сутнасьці, рэспубліка, якая называлася беларускай, закрэсьлівала яго творчасьць,адмаўляла яго як нацыянальнага паэта.У 1918 г., як адзначалася, Купала працаваў непрыкметным служачым у адной з арганізацыяў Заходняй вобласьці. Гісторыкам У. У. Скалабанам выялеўны дакумэнты, што сьведчаць пра кантакты Белнацкама з Купалам. Але яны так і не перараслі ў супрацоўніцтва [29]

У сьвятле сваіх крытэрыяў Купала ацэньвае факт зьліцьця ў канцы лютага 1919 г. Беларускай й Літоўскай савецкіх рэспублік у адзінае дзяржаўнае ўтварэньне з цэнтрам у Вільні. Пасьля гэтай падзеі, адзначае Купала, аб ніякай беларускай незалежнасьці не было ўжо і гутаркі. [30]

Вопыт правядзеньня нацыянальнай палітыкі ў Беларусі, ваяўнічы нацыянальны нігілізм кіраўніцтва Заходняй вобласьці Купала ўспрымаў як праяву агульнай лініі Савецкай улады ў гэтым пытаньні. І калі што-небудзь і рабілася Саветамі ў гэтым напрамку, дык гэта, на яго думку, толькі для формы, вымушана, з тактычных меркаваньняў. Складаны ход нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі (абвяшчэньне ССРБ, абмежаваньне тэрыторыі рэспублік, зьліцьцё ССРБ зь Літоўскай Савецкай Рэспублікай ў адну дзяржаўную адзінку) Купала расцэньваў як паказчык зьневажальных адносін бальшавікоў да аб'яўленага імі права нацыяў на самавызначэньне.

Бібліяграфія

10 Я.Купала.Незалежнасць./Спадчына.1990, №2, с14.
11 Там-жа
12 Янка Купала. Справа незалежнасьці Беларусі за мінулы год // Спадчына. 1989, №2, с.22.
13 Я Купала. Незалежнасць//Спадчына. 1990, №2, с.14.
14 Там-жа
15 Янка Купала. Незалежная дзяржава і яе народы // Спадчына. 1990, №1, с. 18.
16 Янка Купала.Справа незалежнасці Беларусі за мінулы год// Спадчына. 1990, №1, с. 18.
17 Янка Купала. Незалежнасць дзяржавы і яе народа // Спадчына. 1990, №1, с.18.
18 Я.Купала. Торжышча //Спадчына, 1990, №2, с. 15
19 Там-жа. с.16.
20 Янка Купала. Адбудова Беларусі // Спадчына, 1990, №2, с. 16
21 Там-жа, с. 16
22 Там-жа.
23 Янка Купала.Незалежная дзяржава і яе народы // Спадчына, 1990, №1, 19
24 Там-жа
25 Там-жа
26 Янка Купала.Справа незалежнасці Беларусі за мінулы год// Спадчына, 1989, №2, с. 23.
27 Там-жа. с.22
28 Звезда 1919, 5 февраля
29 Скалабан В.В.Гісторыя Малабагамолаўскай вуліцы // ЛіМ. 1984, 14 сьнежня, Янка Купала, Энцыклапедчыны даведнік, Мн.,1986, с.597-598.
30 Янка Купала.Справа незалежнасці Беларусі за мінулы год // Спадчына. 1989, №2, с. 23

Працяг будзе.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Тапаграфія знаходак манэт і аздобаў

Міхась Белямук

Берасьцейская вобласьць

Пінскі р-н

У архіве Эрмітажа знаходзіцца інвэнтарная кніга, у якой запісана, што 9 травеня 1804г Эрмітаж атрымаў ад імпэратара Аляксандра I 20 залатых манэтаў, падараваных шляхцічам Рыдзеўскім з Пінска. Хавальнік старажытных манэтаў К.Келер узяў для Эрмітажа 12 манэтаў, а рэшту зьвярнуў «государю», бо яны былі дублікатамі. Аляксандр I раздаў гэтыя 8 манэтаў высокім саноўнікам. У інвэнтарную кнігу К.Келер запісаў, што ўсе манэты бізантыйскія, але, калі 1960 г. І. Г. Спаскі расшукаў некаторыя манэты, падараваныя Рыдзеўскім, то аказалася, што 4 манэты ў калекцыі Эрмітажа ёсьць манэты кіеўскага князя Уладзімера Сьвятаславіча (980-1015). У дадатак, некаторыя дублеты, якія былі ахвяраваныя саноўнікам, аказаліся ў зборах гр. Н.Румянцава й Я. Райхеля. 2 манэты былі златнікі кіеўскага князя Уладзімера Сьвятаславіча. Такім чынам, з 20 залатых манэтаў, ахвяраваных Рыдзеўскім, 6 былі златнікі кіеўскія, а рэшта была бізантыйскімі залатымі солідамі, пачынаючы імпэратарам Раманам IУ Діагенам (1067-1071) і ягоных наступнікаў, а што-б азначала, імпэратараў бізантыйскіх Міхала УІІ (1071-1078), Нікіфара III (1078-1081) і Аляксея I Комена (1081—1118).

Паўстае пытаньне, ці ахвяраваныя залатыя манэты ёсьць адной знаходкай і ўсе яны былі пасланыя Аляксандру? Прыпушчаем, што Рыдзеўскі ўсе манэты не паслаў, частку затымаў сабе. Ці ўсе манэты былі аднаразавай знаходкай можна па-рознаму думаць, але знаходка ў ваколіцах Пінска такой колькасьці залатой манэты ёсьць імпануючая.

Кропоткин [3]... б.38, № 298; Кропоткин [6]. б. 181, №99, Спасский б. 134-136, Сапсский [2] б. 256-258, Сотникова и Спасский б.16-17, 42, 56, 108.

Пінскі р-н

Перад 1920 г. у ваколіцы Пінска быў знойдзены рымскі жалезны шолам, які меў сьляды пазалоты.

Спицын [2] б.27

Прылукі, Кобрынскі р-н

У мінулым стагодзьдзі каля вёскі знаходзіліся курганы, ў якіх сяляне знаходзілі залатыя і сярэбраныя аздобы.

Спицын б.13.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Пружаны

У сярэдзіне мінулага стагодзьдзя знайшлі рымскую манэту.

Кропоткин [2] б.96, № 1374; Кухаренко [4] б.21, № 13, Рябцэвич б.190, №15, Поболь [2] б. 114, № 237

Пярковічы, Драгічанскі р-н

Прафэсар Выслух паведаміў Цынкалоўскага, што каля вёскі была знойдзена рымская залатая манэта імпэратара Траяна 98-117 г.

Cynkalowski с.133, № 161, Кропоткин[5] 95, № 178, Рябцевич б.191, № 20

Радасьць, Камянецкі р-н

У 1887 г. В. Кухановіч падчас капаньня бульбы знайшоў рымскую сярэбраную манэту імпэратара Траяна 98-117 г.

Кропоткин [2] б.96, №1375, Кухаренко[4] б.20, №1, Рябцевич б.190, №8, Поболь[2] б.105, №134

Ратайчыцы, Камянецкі р-н

У 1959-1960 гг. І. Біруля праводзіў раскопкі могільніка, у курганах знайшоў сярэбраныя аздобы: пярсьцёнак , віты з тонкіх дратоў, скранёвыя 2 кальцы, адно зь іх з «S»-завіткам, 3 бразгоркі на кальцы, 6 шклозалочаных і шклосярэбраных пацеркі.

Бируля б. 120-121

Роўбцік, Пружанскі р-н

У 1970 г. трактарыст К.Журневіч на ўзараным полі знайшоў рымскую манэту імпэратара Траяна 98-117 гг.

Поболь [2] б.115, №238.

Рубель, Столінскі р-н

У 1957 г. Ю. Кухарэнка раскапаў старажытны могільнік на беразе рэчкі Гарыні. У магіле № 25 былі знойдзены шклозалочаныя і шклосярэбраныя пацеркі. У магіле № 47 знайшоў 5 шклозалочаных і адну шклосярэбраную пацеркі.

Поболь [7] б.81, 84 Кухаренко [4] б.32, №25, б.34, № 47.

Рубель, Велямічы, Столінскі р-н

У 1956 і 1957 гг. Ю. Кухаренка раскапываў курганы паміж вёскамі Рубель і Велямічы, У адным з курганоў знайшоў пацерку з матавага шкла, пакрытую пазалотай.

Кухаренко [4] б.48, 26

Сьвішчова, Камянецкі р-н

У 1959 г. І. Біруля раскапаў 14 кургаоў, а В.Сядоў у 1981 г. раскапаў 7 курганоў. Яны знаходзілі ў курганах з жаночымі пахаваньнямі шклозалочаныя пацеркі. Адзін зь іх знайшоў пацерку пасярэбраную філігранавую, упрыгожаную зерню.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Зб. Археалогія, нумізматыка, геральдыка Беларусі, Мн., 1979 г. б. 156, Збор ПГКБ, Берасьць. обл. б. 214, № 848

Трасцьянка, Каменецкі р-н

У 1983 г. Каробушкіна раскапала 19 курганоў, дзе былі знойдзеныя сярэбранае скранёвае кальцо, з «S»-падобным завітком, сярэбраны пярсьцёнак і шклозалочаныя пацеркі.

Коробушкина [2] б. 396, Свод ПИКБ. Брэс. обл. б.240, № 928А

Хацінава, Камянецкі р-н

У 1960 г. І. Біруля раскапаў 14 курганоў і знайшоў сярэбраныя скранёвыя кольцы.

Збор ПГКБ, Брэс. обл. б. 216, №860

Хотамель, Столінскі р-н

Ад 1954 г. да 1957 г. Кухарэнка праводзіў раскопкі на гарадзішчы і знайшоў сярэбраныя аздобы: кальцо скранёвае сяміпрамянёвае, радзіміцкі тып і абломак бранзалета з пашыраным канцом.

Кухаренко б.23, 24, №153 Кухаренко[5] б.91-92, Русанова б.42, № 121, Поболь[6] б.281, №610

Церабшчна або старое Сяло, Столінскі р-н

У 1926 г. М.Новік раскапаў курган, у якім знайшоў сярэбраныя пярсьцёнкі.

Кухаренко б. 21, №139, Лысенко б. 161, № 113

Чахец, Пружанскі р-н

Каля вёскі быў маёнтак Булгарына. В.Рабцэвіч паведаміў М. Белямука, што адшукаў запіску губернскага чыноўніка, у якой паведамляецца, што ў 1838 г. «пры капаньні канавы ў садзе знайшлі некалькі рымскіх манэтаў, але ў ваколіцы маёнтку, гэтак як у ваколіцы горада Ваўкавыска ўжо раней знаходзілі падобныя старажытнасьці. У зборы Булгарына пераховаецца 12 рымскіх сярэбраных манэтаў, якія вялічынёю ў расейскі «четвертак». Яны на адной старане маюць вобраз імпэратара й ягонае імя, на другой —Мінэрву, Маркса, Фартуну, Вікторыю ды іншых міфічных і алегарычных постацяў.

Манэты разложаны адна за другой храналягічна, пачынаючы з Нерва (96-98), 2 манэтаў Траяна (98-117), 4 манэтаў Антоніна Пія (136-161), Фаўстыны (невядама старэйшай ці малодшай), 4 манэтаў Камада (180-192)».

В. Рабцэвіч, працытаваўшы запіску губернскага чыноўніка піша сваю заўвагу: «Размова ідзе тут аб знойдзеньні не аднаго скарбу 1838 г, але аб некалькіх знаходках, у Булгарына толькі частка знойдзеных манэтаў была ў ягоным зборы».

В.Рабцэвіч выдатнейшы беларускі нумізмат і дасьледчык, аспрэчываць апінію В. Рабцэвіча мы не зьбіраемся, пагаджаемся, але застаецца загадкай, ці толькі рымскія манэты знаходзілі каля вёскі Чахец і горада Ваўкавыска?

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Кропоткин [6] б.95, № 179, Рабцэвіч б.191, № 18, Рабцэвіч [6] б.7, Рябцевич б.29

Чахец, Пружанскі р-н

У 1845 г. у маёнтку Булгарына знайшлі рымскую медзяную манэту.
Рябцевич б.190, № 16

Бібліяграфія

Полоцак №18 Кропоткин [2], Рябцевіч, Поболь [2]
Полоцак №21 Кропоткин [3], Сотникова, Спасский
Полоцак №26 Лысенко
Полацак №27 Кухаренко,
Полацак №28 Спицин, Кухаренко [4], Кропоткин
Полацак №29 Кропоткин [6], Поболь [6], Рябцевич [6]

Бируля И. В. Курганы у дер. Ратайчыцы. Сб. Древние славяне и их соседи. МИА, 176, М., 1970 г.

Коробушкина [2] Т.А. Изучение курганоў Белорусского Побужья. Сб. Археологические открытия за 1983 М., 1985,

Кухоренко [5] Н.В. Раскопки на городище и селище Хотомель.—КСИИМК, вып. 68, М., 1957

Поболь [7] Л.Д. Антычныя шкляныя пацеркі з раскопак у Чапліне — Весьці АН БССР, №4, Мн., 1966

Русанова И.П. Словянские древности УІ—ІХ вв. между Днепром и Западным Бугам. САИ, вып. Еі-25, М., 1973

Спасский И.Г. Нумизматика в Эрмитаже. Очерк истории Минцкабинета —Отдела нумизатики. Нумизматика и эпиграфика, т. УІІІ, М., 1970.

Спасский[2] И.Г. Новые данные о златниках Владимира Сьвятославича. Вспомогательные исторические дисциплины ч. УІ, Л. 1974 г.

Спіцын[2] А. Аб сучасным становішчы археалёчных дасьледаў у Беларусі. Працы Першага Зьезду дасьледчыкаў беларускае археолёгіі і арэографіі. Мн. 1926,

Рябцевич [7] В.Н. О чем рассказывают монеты. Мн., 1977, выд. 2-е

Cynkalowski A. Materialy do pradziejow Wolynia i Polesia Wolynskiego. War. 1961



1



2

1. Сярэбраная манэта рымскага імпэратара Траяна (98—117)
2. Златнік кн. кіеўскага Уладзімера Сьвятаслававіча (980—1015)

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Сьведчаньні Аркадзя Смоліча

ад 7. УІІ—1930 г.

Моя деятельность в 1924-1928 гг.

От работы в НКЗеме я стал отрываться ещё с осени 1923 г., когда президиум ЦИК поручил мне для своего издания «Беларусь» срочно написать большую статью об экономическом положении Белоруссии в дореволюционную эпоху. Для этой цели я был освобожден от работы в НКЗеме на 1,5 или 2 месяца. Затем в январе 1924 г. НКПрос командировал меня, как географа, на Всесоюзную Краеведческую конференцию. По приезде с последней я организовал Центральное Бюро Краеведения БССР и был назначен его председателем. За 1924 г. под моим руководством—ЦБ Краеведения провело две краеведческие конференции —Всебелорусскую и Минскую,что ускорило развертывание краеведческой сети на местах.

Весною 1924 г.—Инбелкульт, по моему предложению, созвал конференцию почвоведов, работавших тогда в Белоруссии. Эта конференция должна была увязать работу по изучению почв, проводившуюся разными методами Минским и Горецким Институтами. Конференция была очень плодотворной, благодаря большому вниманию к ней, проявленному Горецкой профессурой. Была вынесена резолюция о необходимости для увязки работы по изученую природы Белоруссии, создать при Инбелкульте или Госплане Комиссию по изучнеию естественных производительных сил (КЕПС). Такая комиссия и была создана затем при Госплане, но,не имея ни штата,ни необходимых средств, не могла дать больших результатов. Конференция значительно подняла авторитет Инбелкульта, который до того времени считали исключительно терминологическим учреждением. С другой стороны Горецкий Институт выявил свои заслуги по изучению природы Белоруссии, что впоследствии играло роль при решении вопроса о месте сельскохозяйственной Академии.

В апреле 1924 года Госплан пригласил меня для проведения в срочном порядке районирования укрупненной Белоруссии. Я был назначен—секретарем комиссии по районированию, которой непосредственно руководил Пред. Совнаркома т. Адамович, а его заместителем был Дыло. Вместе с последним мы и провели основную работу по этому вопросу .Я дал целый ряд вариантов окружного деления,из которых СНК по моему докладу выбрал деление на 10 округов.

Затем в расширенном составе комиссии по заранее выработанному методу было установлено деление и, наконец, необходимо было руководить работой на местах по проведению сельсоветского деления, увязывать,исправлять и систематизировать получаемые оттуда материалы. Эта работа отнимала все время, и я опять был освобожден от своих обязанностей по НКЗему, хотя официально там числился. Всю работу за меня и за себя вел там Кисляков, я же изредка приходил в отдел для руководства разработкой своих бюджетов.

К постоянной работе по НКЗему я уже больше не вернулся.Кажется,только в конце года я принимал участие в разработке проекта жирнала «Плуг». По моей мысли, журнал должен заменить собою на местах агронома и при том агронома, ведущего пропаганду на белорусском языке, что тогда было редкостью. Я поэтому настаивал на возможно большей популярности и

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

массовости, как содержания, так и языка и стиля журнала. В дальнейшем я был включен в редколлегию журнала, но фактически участие в ней принимал очень мало, т.к. коллегия вообще не собиралась. Я только несколько раз давал редактору журнала Тупеневичу свои замечания по поводу языка и стиля, на первых порах меня не удовлетворявшего, благодаря своему канцелярскому характеру. Всю работу по журналу проводил Тупеневич, молодой агроном, член С.Х. секции ИБК, белорусский националист. Направление журнала было в общем техническое. Прищепов и др. работники НКЗема помещали в нем и руководящие статьи, направление коих соответствовало тогдашней политике Наркомзема и популяризировало ее.

Районирование, по-видимому, было проведено удачно; об этом говорит постановление СНК, коим вынесена мне и Дыло революционная благодарность за эту работу. Вскоре последовало назначение обоих нас в Инбелкульт, который тогда реформировался в солидное научное учреждение с постоянным штатом. Я был назаначен Зам. Председателя Института, а Дыло его научным секретарем.

Председатель ИБК В.М.Игнатовский тогда был Наркомпросом и не мог уделять достаточно винимания ежедневной работе, которая и была возложена на меня и на Дыло.

С этого времени (январь 1925 г.) я совершенно оставляю НКЗем и перехожу на работу в Инбелкульт. Работы этой на первых порах было очень много. Мы только что получили специальное здание и производили всю зиму его ремонт. Людей и средств было недостаточно. А тем временем новое положение Инбелкульта и вмнимане, проявленное к нему правительством и общественностью, обязывало .Приходилось массу времени отдавать на представительство в различных органах,на участие в съездах и собраниях, рекламируя всюду знаменательный факт создания в Белоруссии почти что Академии наук, хотя и носящей пока иное название.Имя Инбелкульта тогда было очень популярно в массах как яркое достижение Совестской Белоруссии.

Однако, мало было рекламировать Институт, надо было его и строить .От старого периода осталось ряд секций, в которые теперь влился целый ряд новых членов ИБК, преимущественно ответственных партийных работником. К сожалению, последние появлялись довольно редко и руководство работой осталось по-прежнему в руках националистической интеллигенции. О результатах этого руководства мною говорилось в прежних показаниях. На фракции ИБК, куда обычно меня приглашали для информации о ходе работы, я настаивал на повышении активности партийных работников, по этому поводу принимались резолюции, но результатов это больших не дало. Тольки в нескольких секциях (сельскохозяйственной, медицинской, педагогической, прававой) работали ответственные партийные работники —Прищепов, Барсуков, Балицкий, Червяков, да кроме того большую активность проявлял т. Виленстович, назначенный вместо меня председателем ЦБ Краеведения.

Организация секций происходила таким образом. Президиум ИБК назначал руководящую тройку (президиум секции), обычно под председательством партийца. Эта тройка формировала состав секции из ее прежних членов с дополенением новых сил. Список членов подавла на утверждение в Президиум ИБК и им утверждался обычно полностью. Отводы делались преиму-

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

щественно с точки зрения квалификации членов. Помню такие отводы по секции искусств, куда было первоначально включено много рядовых артистов, не имевших никаких данных для работы в Инбелкульте.

Об отводах по идеологическим или политическим мотивам —не помню.

Организационная работа секций находилась вообще под моим контролем, а некоторые секции, наиболее слабые, приходилось мне самому непосредственно организовывать, так было дело в отношении социально-экономической секции, которую впрочем оживить так и не удалось из-за инертности или может быть занятости ее участников. Секция природы, несмотря на мои усилия еле существовала по тем-же причинам.

Кроме секций в то время уже начиналась организация постоянных штатных органов—комиссий. В начале комиссии основаны были, главным образом, по гуманитарным дисьциплинам. Я прилагал усилия, чтобы организовать подобную работу по природе. Это удалось в середине 1925 г. благодаря тому, что СНК постановили передать Инбелкульту от Госплана комиссию естественных производительных сил с ее средствами (10 тысяч). За эти средства силами университетских и институтских работников проводилась экспедиционная работа, в дальнейшем были обещаны большие средства. Не имея в то время возможности лично заняться этим большим делом, я выдвинул для работы в НКПС кандидатуру Тремповича, о котором слыхал, как о хорошем администраторе и который тогда ещё недавно приехавший в Минск не был достаточно нагружен работой.

В прошлом он принимал участие в работе БНР, затем работал на Украине врачем и оттуда был вызван Наркомпросом для преподавания в Белгосуниверситете.

Уделялось мною некоторое время и сель-скохозяйственной секции ИБК. В ней организованы были и подсекции—лесная (Пред. Белюнас), разработавшая лесную терминологию, популярной с.хоз.литературы (там работали Грабовский и Тупеневич) и кустарных ремесел (пред. Трофимов). Работали эти п/секции самостоятельно и моего участия почти не требовали.Лично же мною было организовано составление сельскохозяйственной терминологии, для которой я дал основной текст. Наиболее значительным событием в жизни с.хоз. секции в 1925 г. было ее участие в организации Сельскохозяйственной Академии в Горках. Грабовский —секретарь с.хоз. секции, одновременно и инспектор с.хоз образования в Наркомпросе получил задание от НКПроса составить проект заполнения штатов Академии с возможно большими усилением там количества белорусских работников с целью ускорения белоруссизации Академии, как наиближе стоящей к работе в деревне высшей школы. По этому поводу Грабовский обратился ко мне с предложением перехать на работу в Горки и рекомендовать других белорусских кандидатов. Сам я переезжать туда отказался, что-же касается других возможных кандидатов, то список их мы ориентировочно составили, а когда в Минск приехала Горецкая делегация для участия в работе комиссии по организации Академии, то мы созвали президиум секции вместе с этой делегацией и намеченными нами кандидатами с целью просмотра и дополнения их списка и некоторого морального воздействия на отдельных кандидатов, которые (напр. Кисляков) отказывались ехать без особых оснований. В результате человек 5 членов секции —наиболее квалифицированных —переха-

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

ло на постоянную работу в Горки (Кисляков, Скандраков, Лайков, а также Горецкий, заканчивавший тогда свою аспирантскую подготовку в Москве). Затем я принимал участие в комиссии по организации Академии и выступал там с защитой кандидатур членов секции, хотя больших возражений кандидатуры вообще не встретили.

Несколько позже в связи с образованием Горецкой Академии возник вопорс об организации там научно-исследовательского дела. Проф. Кайгородов выступил с проектом создания при Академии самостоятельного Института по изучению естественных производительных сил Белоруссии. Я возражал против этого проекта, т.к. он создавал параллелизм в работе с нашим КЕПС и угрожал руководящей роли Инбелкульта—будущей Академии Наук— во всем научно-исследовательском деле. Так как проекта Кайгородова в Минске никто не поддержал, то пришли в конце концов к соглашению на том, что в Горках будет открыт филиял Инбелкульта на правах его секции. Этот филиал и возьник в виде «Горецкого Научного О-ва по изучению Белоруссии». Руководящую роль в нем вскоре, благодаря поддержке Инбелкульта, и в частности моей, заняли белорусские работники, как местные, так и приехавшие из Минска, а также русские профессора белорусофилы—Лунсгерсгаузен, Кадров-Зихман и др. Националистически настроенные работники Академии объеденились вокруг О-ва и не допускали туда некоторых профессоров-русификаторов. На этой почве несколько обострились отношения в Академии и возникли отдельные конфликты. Один из таких конфликтов с проф. Фроловым, непосредственной причиной которого был спор об авторском праве, но который имел несомненно национальную окраску, пришлось разбирать Президенту ИБК и еле удалось уладить. Бывали конфликты и в среде самих белорусских работников Академии. Один из них, между Кисляковым и Демидовичем, поссорившимися между собою из-за влияния на работу О-ва, пришлось улаживать мне лично.

Оставшееся от работы в Инбелкульте время, я использовал для подготовки к печати своего «Краткого курса географии Белорусии», заказанного мне Белгосиздатом для выполнения в срочном порядке. Учебник этот был построен на основе более обширной моей работы, изданной в Вильне в 1919 г. и затем 2 раза там переизданной, благодаря невнимательности цензуры. Несмотря на свою националистическую окраску, книга была запрещена в Польше, а в Латвии за ее распространение ряд более русских культурников (Красковский, Мядзелка и др.) даже обвинялся в государственной измене и был брошен в тюрьму на полтора года. Для Белгоиздата я совершенно переработал эту книгу, но все же в нее попало несколько националистических мест, отмеченных в свое время тов. Криницким. Из них я помню одно, где говорится о классовом составе польского населения в Белоруссии и совсем не упоминается о польском крестьянстве. У меня был тогда действительно взгляд, что крестьянство, которое называет себя польским на основании гл. образом религиозного признака, следует все-же по признаку языка относить к белорусам-католикам. Такой взгляд является шовинистическим и противоречил нацполитике партии. Продумав этот вопрос, я изменил соответствующее место в книге равно как внес и другие указанные мне поправки. Книга была напечатана уже в исправленном виде и разошлась в количестве 55.000 экземпляров.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

ПАМЯЦЬ ЗЯМІ

З перажытага

Янка Жамойцін

Янка Жамойцін: —Я трапіў да вас у Дэссаў у 1944 г. Памятаю клопаты тваёй сястрыцы Анелі, якую немцы прасьледавалі за навучаньне дзяцей. Нельга было-б не заўважаць, што вашае маткаваньне дзецям ды высілкі цэлай апякунчай кадры СБМ паступова матарыялізаваліся, умовы зьмяніліся на лепшыя. Унармаваўся час працы, дзеці сталі задбаныя, чыстыя, нядрэнна апранутыя, зарганізаваныя. Навучаньне роднае мовы, адчуваньне абароны і падтрымкі апякуноў,— усё гэта зняло пачуцьці страху і бязнадзеі, якія апанавалі дзяцей напачатку, ды зьяднала іх з кіраўнічай кадрай.

У палове красавіка 1945 г. паліцыя выгнала нас зь дзяцьмі і тысячамі іншых чужаземных працаўнікоў з гор. Дэссаў пад пагрозай расстрэлу ў выпадку непадпарадкаваньня. Пасьля 12-гадзіннага маршу, перапыненага пулямётнаю стральбою з самалётаў, наш канвой раптоўна згубіўся. Мы апынуліся ў лесе непадалёк горада Цэрбст, пакінутыя собскаму лёсу. У лесе ініцыятыву перанялі «мужчыны». У здабываньні ежы рабілі падходы на вясковыя капцы з бульбаю за лесам і т.д. Да «мужчынскіх» даручэньняў належыла капаць акопы ў лесе, якія зьбярагалі днямі ад куляў самалётаў, а начамі ад холаду. Сілы аднак паступова чэзьлі з кожным днём. У выніку нарады было пастаноўлена дамагацца дазволу павароту ў Дэссаў. На мяне выпаў лёс выкананьня гэтага даручэньня. Хлопцы аднекуль здабылі для мяне камбінэзон, як маскіроўку, каб не затрымалі мяне франтавыя войскі. Я неяк дабіраўся да Дэссаў, дзе ўдалося перайсьці мост на Эльбе, і ён быў зараз-жа узарваны. Такім чынам, парвалася сувязь між вамі і мною. Як пакіраваў лёс вамі?

Вера Катковіч: —Нам не удалося дабрацца да Дэссаў. Над Мульдай (даплыў Эльбы) затрымалі нас амэрыканскія жаўнеры, а неўзабаве наступілі ўсходнія саюзьнікі. Пераход у абшар дзеяньня амэрыканскай арміі быў забаронены пад пагрозай расстрэлу. Дзяцей перанялі ад нас расеяне. Гэта было драматычнае расстаньне, аб чым апісала шырэй мая сястрыца Аеля ў сваіх успамінах. Пасьля ня менш драматычных прыгодаў мы з Анеляй навязалі су-вязь з польскай вайсковай місіяй ў Бэрліне і там працавалі. Мяне звольнілі з працы у 1948 г. і загадалі выехаць у Польшчу. У Вроцлаве на пачатку ліпеня 1949 г. я выйшла замуж за майго колішняга сябру Станіслава Клентака, а 12 жніўня 1949 г. мяне арыштавалі, адвезьлі ў Варшаву й пасадзілі ў падвале міністэрства бясьпекі, што пры вул. Катыковай

Я.Ж.—Гэта «прытулак» без якіх колячы кантакта ў з вонкавым мірам, мне таксама ведамы, бо прыйшлося «пасяліцца» ў ім 13 сьнежня 1949 г. Думаю, што ў гэтым ёсьць планамернасьць нашых прасьледаваўцаў. Як ты перанесла пачатак таго зьняволеньня?

В.К.—Гэта быў нечакана вялікі удар. Пасадзілі мяне ў катух 1,5 на 2 м, страшэнна душны. Няўзабаве даведалася, што Аня ў суседняй камеры. Я не магла есьці і вельмі пакутвала. Аднойчы, выносячы «парашу», самлела. Аказалася, што ўжо была цяжарная. Толькі тады перавялі мяне ў іншую камэру, а ў лістападзе 1949 г. прынесьлі нейкі плашч (я была ў летняй вопратцы) і перадалі мяне «старэйшаму брату», г.зн.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

КДБ пры вул. Ягелёнскай у Варшаве. Тут зноў падвал, але поўны блох, халодны, з нарамі да спаньня на голых дошках без прыкрыцьця. Я стала адчуваць вельмі пакутна цяжарнасьць. У выніку зажаданай гутаркі з пракурорам атрымала ў даволі хуткім часе ад мужа адзеньне. Некаторыя жаўнеры з аховы выказвалі спачуваньне. Адзін нават пераслаў ліст мужу, іншыя былі, што зьверы.

Пасьля новага 1950 году—этап у Лігніцу.Я,адзіная жанчына,і 10 мужчын у таварным вагоне халодным, як самая зіма. Куда нас вязьлі ніхто з нас ня ведаў. Адгароджаны ад вязьняў жалезнай кратай, нас вартаваў жаўнер з хуткастрэльнаю зброяй. Апрануты ў кажух і валенкі, ён быў нашым уладаром, без дазволу якога нельга было варушыцца, гутарыць, нават спраўляць фізыялягічныя патрэбнасьці. У Лігніцы, у савецкай контрразьведцы, аказалася, на іронію, што я зусім не арыштаваная, а толькі падрыхтаваная да павароту на «родину».

У сувязі з гэтым мне дазволілі гутарку з доктарам, завялі ў баню, пасялілі ў чыстую, але турэмную камеру. Ідылія трывала аднак коратка. На пераломе студзеня і лютага 1950 году вывезьлі зноў этапам у таварным вагоне ў Брэст. У брэсцкай турме ўжо не цацкаліся. Швырнулі мяне ў камеру, дзе былі 4 бытавыя вязьняркі, што працавалі ў кухні й у камеру амаль не вярталіся. Ноччу заатакавалі мяне пацукі, ды такія нахабныя, што я не магла ад іх абараніцца. Нарабіла гістэрычнага крыку, а таму мяне адтуль вывелі, але толькі раніцай. Я дабілася гутаркі зь якімсьць турэмным начальнікам — палкоўнікам. На яго загад перасялі мяне ў іншую камеру, зь якой няўзабаве завялі пад экскортай на вакзал. У Менск везьлі мяне ў спальным вагоне,у асысьце афіцэра КДБ і пасялілі ў турме КДБ пры Камсамольскай вуліцы.

Турму тую вязьні называлі «амэрыканкай». Тут павялі мяне на гутарку з начальнікам турмы і пракурорам,якія пацьвердзілі, што я да гэтага момэнту была «вольным грамадзянінам СССР». На заканчэньне гутаркі начальнік павядаміў мяне афіцыйна, што пракурор накладае на мяне арышт, падае сьледству і прад'явіў «ордэр на арышт».

У «амэрыканцы» я таксама месца не сагрэла, бо перавялі мяне ў турму пры вул Валадарскай, дзе 21 сакавіка 1950 года нарадзіўся мой сынок. Назвала я яго імем бацькі Стасям, а папулярна называлі Славікам. Тут пачалося сьледства.

Я.Ж.—Як ты сабе давала рады з немаўляткай, у як захоўваўся сьледавацель?

В.К.—Маім следавацелям быў старшы лэйтэнат Кутузаў. Першы месяц мяне не турбавалі. Пасьля цягалі на дапросы зь дзіцям Кутузаў быў нераўнаважным, і ў залежнасьці настрою раз быў агрэсыўны, іншы раз—людзкі і ўдаваўся ў гутаркі. Наогул, сьледства было, ведама, цяжкім, але ў параўнаньні з тым, што чакала мяне ў этапах падарожжа ў лягер ды ў самым лягеры—гэта можна назваць камфортам.

Я.Ж.—Якія закіды ў сьледстве залічаеш ты да асноўных?

В.К.—Галоўны закід гэта антысавецкая нацыяналістычная дзейнасьць у СВМ. Прычым праца ў сэньсе нацыянальнага ўзгадаваньня разглядалася як нацыяналістычная, і гэта кваліфікавалася як здрада. Практычна, матыў, раздуты савецкай прапагандай, закіду ў калабарацыі,ня быў прадметам зацікаўленьня сьледавацеля. Галоўнае для яго было даказаць сьведамую антысавецкую нацыяналістычную дзейнасьць. Кутуза ў ведаў добра, што я заўсёды была акружана дзяўчатамі ці дзяцьмі, знаў маё заданьне, аб якім я ўспамінула на пачатаку. Дзеля

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

пабольшваньня маіх «злачынстваў» залічыў да іх ліку, між іншым удзел у сьвяткаваньні 25-годзьдзя Віленскай Беларускай Гімназіі, удзел у паховінах замардаванага праф. Аляхновіча, прысутнасьць на II Кангрэсе.

—Я.Ж. Кутузаў некалькі разоў начамі заступаў майго сьледавацеля—маёра Вінакурава. У гутарцы зь ім я пераканаўся, што ён вельмі добра ар'ентаваўся ў справах беларускага нацыянальнага руху, не паказваў нянавісьці да нашай дзейнасьці, а хутчэй стараўся задэманстраваць абыякавасьць, як да зьявішча малаважнага, і ў ягонай ацэнцы нэраальнага. Ён павядоміў мяне, што ў Менскай турме ты з Анелай зьяўляецеся яго «падапечнымі». Абяцаў мне спатканьне з вамі, у што я ня верыў. Аказалася, што даставіў вас на мой суд пад выглядам сведкаў. На маю думку, ён зарганізаваў гэтае «спатканьне», каб даць магчымасьць пабачыцца Ані з табою і дзіцям. Апрача таго, яму быў ведамы ўжо Ваш прысуд, 10 год заключэньня, які быў рашэньнем «особого совещания». Нормай у палітычных правах у тым часе было зьняволеньне на 25 гадоў у «исправительно-трудовых лагерях (ИТЛ), ды яшчэ «особых». Кутуза ў лічыў тады «добрадзействам» асуджэньне на 10 гадоў, што было высілкам яго працы. Не было яму сакрэтам, што Вінакураў сваёй заўзятасьцю падрыхтаваў мне непараўнальна больш жорсткую расправу, хоць справы нашыя былі падобныя.

В.К.—Гэта праўдападобна. У кожным выпадку, за некалькі дзён мяне і маю сястру фактычна павядомілі аб рашэньні «особого совещания» пры Вярхоўным Савеце СССР і зьняволілі кожную з нас на 10 гадоў у ИТЛ (исправительно-трудовух лагерях).

Я.Ж.—Якое ўражаньне выклікала ў цябе гэтае рашэньне?

В.К.—Уражэньні ўсіх шматлікіх соцен асуджаных былі хіба аднолькавыя, і ты маеш таксама адказ на гэтае пытаньне. Мае перажываньні розьніліся тым, што яны канцэнтраваліся галоўным чынам на лёсе майго сыночка, зьняволенага ад нараджэньня.

Я.Ж.—Турботы твае былі зразумелыя, тым больш, што ніхто з палітычных зьняволеных ня мог разлічваць на датэрміновае звальненьне. Даўжыня тэрміну фактычна ня мела вялікага значэньня. Бо было ведама, што нават калі ён і скончыцца, то калі ў дасца дажыць, цябе чакае ссылка ў Сібір альбо зноў завочнае прадаўжэньне зьняволеньня. Людзі, зьняволеныя фізычна, былі вызваленых аднак ад страху. Адносілася гэта ня толькі да палітычных вязьняў, асуджаных на поўную катушку», што азначала на 25 гадоў, і тых, хто быў схоплены за зьбіраньне каласкоў на пажні, ці за ўкрадзены з палетку мяшок бульбы. Усе, хто сядзеў у «исправительно-трудовых» лагерах, спадзяваліся, што пануючы кашмар ня можа быць доўгавечным. Важна было, каб не страціць сілы, а ў меру магчымасьці і здароўя, каб ператрываць. Вернемся аднак да твайго самапачуцьця.

В.К.—Я адчувала сябе таксама не найгорш з маім Славікам. Час ад часу ўдавалася ўбачыць на карыдоры турмы сястру Аню. Ведама было, што асуджаных з «амэрыканкі» перавозілі да нас на Валадарскую. Праўду кажучы, нашыя дарэмныя стараньні трапіць на твой сьлед, занепакоілі мяне. Жорсткае захаваньне пракурора на судзе й ягоныя дамаганьні прыгаварыць цябе да вышэйшай меры, наводзілі на розныя думкі. І калі пасьля 2-х тыдняў абсалютнага няведаньня аб тваім лёсе, пачула твой сьпеў у часе прагулкі «Расцьвіталі ў полі васілёчкі» мне стала лягчэй на душы, быццам камень з плячэй зьляцеў. На Валадарскай у турме быў лагоднейшы рэжым, і спевы

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

хоць і былі недазволеныя, але і не прасьледаваліся.

Я.Ж.— Прадчуваньні твае былі небеспадстаўнымі. Пасьля суда кінулі мяне на 2 тыдні ў падвальную адзіночку з жорсткай вартай і абмежаваным харчаваньнем: кусок хлеба і кружка вады ў суткі. Я думаю, што гэта мела нешта супольнае з садыстычнымі намаганьнямі пракурора, тым больш што на судзе я выключыў з удзелу адваката, *ягонага сябру, зь якім мне не давялося* нават пабачыцца перад судом. Гэты жэст у сэньсе тактычным быў наіўны з майго боку. Палічылі-ж яго абразьлівым для савецкага «правасудзьдзя». На шчасьце, мне ўсё-такі зацьвердзілі дарованую судом «катушку» і перавялі ў турму на Валадарскую перад этапам у лягер. Аднак асноўнаю тэмай нашай гаворкі зьяўляецца твой лёс.

В.К.—Пад канец кастрычніка 1950 г. павезьлі мяне зь дзіцям і іншымі вязьнярамі ў лягер. Падарожжа адбывалася этапамі зь перапынкамі ў турмах: Масквы, Горкага, Арзамаха, Сьвярдлоўска, Петрапаўлаўска, Карагандзы, Карабаса. У рэшце, я трапіла ў Кінгір, у жаночы лягер.

Я.Ж.—Шаную Вера тваю ўстрыманасьць ва ўспамінах, але таксама памятаю цяжкія да вытрыманьня нават для маладых здаровых хлопцаў умовы вязьнярскіх этапаў. Ты-ж была слабаю фізычна жанчынай з грудным дзіцям. Разумею таксама, што не магчыма перадаць у кароткай гутарцы глыбіну тых мукаў, якія прыйшлося перажыць табе. Аднак паспрабуй пераказаць хоць частку эпізодаў з твайго шляху няўзгодаў.

В.К.—У этапах чыгуначнага падарожжа мне прыходзілася займаць зь дзіцям месца заўсёды на найвышэйшай, трэцяй паліцы, самай нязручнай, але найменш абдаванай халодным паветрам, асабліва ў часе даволі доўгіх праверак, пераліку вязьняў і г.д., калі дзьверы вагона былі адчы-неныя.

Атрыманых на падарожжа прадуктаў: салёная рыба і хлеб,— мусіла хапіць на ўтрыманьні толькі мяне, бо Славіку не прадугледжвалася харчаваньня. Карміла я яго толькі собскім малаком, якога лёс, на шчасьце, не паскупіўся ня толькі на кармленьне дзіцяці, але і на абмываньне яго, бо ня было іншай магчымасьці. Прасьвет між паліцаю і стольлю вагона быў такі невялікі, што *можна было толькі ляжаць ці аперціся на* локці. Кармленьне Славіка і ўтрыманьне яго ў сякой-такой гігіене было сапраўднай пакутай. Сынок мімікай папярэджваў аб сваіх фізыялігчных патрэбах, чым памагаў мне зьбярэгчыся ад лішніх клопатаў і забруджаньня. Да горада Горкій ехала ў адным вагоне са мной сястра Анеля, і ў самы цяжкі час яна мне вельмі дапамагала. Першы этапа скончыўся ў Маскве, дзе загналі нас у бутырскую турму. Камеры былі да поўнага панатыканыя вязьнямі. У куце параша, якая маментальна перапаўнялася. Але нашыя дамаганьні вынесьці яе ці выпусьціць людзей у туалет заставаліся без рэакцыі з боку турэмнага надзору. Неўзабаве пацякло ўсё, і камера напоўнілася смуродам. На шчасьце, нядоўга нас тут трымалі. Зноў пачаліся падарожныя мукі.

На наступнай перасылцы ў Горкім завялі нас ў баню, а адзеньне ўзялі на пражарку дзеля дэзынфэкцыі. У бані той зь дзіцям не ўдалося нам з Аней адваяваць пасудзіны на воду, і ў рэшце трапілі толькі пад халодны душ. Сяк-так абмыліся самі і крыху абмылі Славіка, які прастудзіўся і ледзь удалося зьбярагчы яго ад паважнейшай хваробы. Да таго-ж з пражаркі атрымала я сваю каракулявую куртку зусім пражаранай, пакурчанай і цеснай. Апрача таго, Аню забралі ў іншы этап, ня даўшы нам нават магчымасьці разьвітацца.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Перасыльны пункт у Сьвярдлоўскай турме запамятаўся калёніяй прусакоў, што залазілі ў кожную шчыліну і выбівалі людзей з апошніх сілаў, не даючы адпачыць. Там сустрэлася і з чалавечнасьцю. Нейкія старэйшыя ад мяне беларускія жанчыны зь іншага этапу зьвярнулі ўвагу на мяне паўжывую *ад зьнямогі зь дзіцям і прынесьлі* сухары з хлебам. Успамін пра гэтае здарэньне да сягоньня застанецца жывым і узрушаючым. Сынок мой, на шчасьце, разьвіваўся, на тыя ўмовы задаваляюча, а псыхічна нават вельмі добра. Быў ён вясёлы і яго ўсе любілі.

Са Сьвярдлоўска сталі нас рассыляць у рабочыя лагеры. Мяне вывезьлі на перасыльны пункт ў Петрапаўласк, адтуль накіравалі пачаткова ў Караганду, а пасьля ў Карабах. Увесь час везьлі ў кузаве грузавога самаходу. Нарэшце, пасялілі ў Карабаскім мужскім лягеры ўзмоцьненага рэжыму, у неагрэтым памешканьні з нарамі без пасьцелі (адны дошкі). На шчасьце, і там знашліся зычлівыя людзі. У лягернай адміністрацыі былі японкі з спрадвечнымі традыцыямі культу дзіцяці. Вось яны і ратавалі мяне зь дзіцям ад голаду, хоць за гэта ім пагражала *немалая* кара.

Працістаўнымі гуманным адносінаў вязьняў, былі жорскія адносіны да мяне лагернага надзору. Праз некалькі дзён жыцьця у Карабаскім лягеры мне загадалі: «Собирайся с вещами». Поўная надзеі на заканчэньне цяжкасьці падарожжа, загарнула Славіка ў коўдру, схапіла валізачку з рэчамі і выйшла. Канвой зь пяці жаўнераў і афіцэра КДБ прыняў мяне за паквітаваньнем. Зь лягера вывялі на ўзгорыстую стэп, дзе я шораз падала зь дзіцям, пасылаючы праклёны канваірам і трацячы паступова апошнія сілы. Просьбы памачы мне толькі павялічвалі лютасьць і грубіянства афіцэра і штурханьні жаўнераў. Ня ведаю, як доўга трывала тая мука, але давялі мяне да якогасьць чыгуначнага паўстанку ўжо сумеркамі. Аказалася, што цягнік да якога вялі мяне, які праходзіць туды раз у тыдзень, ужо адыйшоў. Зьдзівэлы ад злосьці канвой увёў мяне ў закураны, перапоўнены *людзьмі, што чакалі суткамі на цягнік*, пакой. Я стала да сьцяны, ледзь жывая і абясьсіленая. Калі афіцэр загадаў зьбірацца ў паваротную дарогу, я не магла зварухнуцца ад стомленасьці ды болі ў кожным суставе ног, рук, у кожным кавалачку цела. На штурханцы жаўнераў таксама не рэагавала, а ў канцы не вытрымаўшы, стала крычаць на афіцэра, каб выканаў пагрозу, скіраваную да мяне ў дарозе і застрэліў нас. Сярод нясмелых спачатку людзей узрастаў непакой. Урэшце, некалькі жанчын, за імі і мужчыны, сталі бараніць мяне. Канвой дзесь прапаў і людзі сталі памагаць мне ўціхамірыцца самой дзу супакоіць Славіка. Сярод ночы канвой зноў зьявіўся. Жаўнеры схапілі дзіцё ды мяне пад рукі, вывялі ў марознае надвор'е і кінулі нас абодвух у запрэжаныя сані, што прыгналі з перапалоханым казахам. Давезьлі нас назад у лягеры ўтаўкнулі ў *той самы халодны барак усіленага* рэжыму, каб за тыдзень паўтарыць мукі падарожжа. На гэты раз далі мне дзіцячыя санкі, якія крыху аблегчылі мае мукі, але выварочваліся што раз на буграватай слізкай трапіне. На цягнік усё-такі мы пасьпелі. І ў студзені 1951 году, пасьля двух месяцаў кашмарнага падарожжа, я апынулася ў жаночым лягеры ў Кінгіры.

Я.Ж.—Разумею, што прычынаю той драматычнай валакіты з лягера ў лягер быў Славік. «Капцы» рабочай нявольнічай сілы не хацелі прымаць у свае рабочыя лагерныя пункты жанчын з дзецьмі, а таксама вязьняў хворых, старых, зь якіх не магчыма было

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

выціснуць столькі, як з маладых здаровых. Іншая справа ў так вялікім жаночым лагерны як Кінгіры, там можна было ўтрымаць і старых вязьнярак, якія апекаваліся дзяцьмі ці рабілі іншую дапаможную лягерную працу. У такім выпадку маладыя мацеркі маглі быць выкарыстаны на цяжкіх работах, а іх дзяцьмі апякаваліся старыя жанчыны.

В.К.—Так яно і было. Мяне адразу «запраглі ў ярмо». Рабочы час для вязьнярак 10 гадзін у суткі, адзін дзень у месяцы быў вольны.Праца мая была цяжкая: земляныя выкапы пры будове масту на пояс у вадзе, выладоўваньне вапны ці вугля, разгрузка цэменту, што пранікаў у дыхальныя органы, у вочы і цераз адзеньне прыліпаў да сапцелага цела. Разгрузка дрэва вымагала сілы і была вельмі небясьпечная праца.

Быў голад, а тут яшчэ трэба было карміць грудзьмі Славіка. У турмах этапа не было іншай магчымасьці і хлопчык прывык выключна да матчынага малака,якога на шчасьце ў мяне ўвесь час хапала. Славік быў асалодай той горкай долі. Хоць яму яшчэ не споўнілася годзіка, але ён засыміляваўся да лягерных умоваў, быў вясёленькі, кожны дзень вітаў мяне з радасьцю, і не гараваў, калі я яго пакідала няням.Ідылія аднак трывала ня доўга. Калі хлопчыку споўнілася год і 3 месяцы, у канцы траўня 1951 года адабралі ў мяне дзіцятка і перамясьцілі ў дзіцячы садзік, што за лягерам. Маленькі і там пачаткова быў спакойны, чакаючы мяне. На жаль дарма. Мінуў звычайны час растаньня і, не дачакаўшыся меня, ён стаў непакоіцца і плакаць. Прывыкшы да грудзей і занепкоены маёй адсутнасьцю, не прымаў ніякай яды без перапынку плакаў і звaў маму. Мае дамаганьні дазволу пабачыцца зь дзіцям, каб хоць накарміць яго заставалася беспасьпяховымі. Урэшце рэшт, на адзінаццаты дзень канвой вывя ў мяне ў дзяцінец. Поўную надзеі на спатканьне са Славікам прывялі мяне да паўпрытомнага, засінелага ад голаду з вздутым жывоцікам дзіцяці, пабуджанага час ад часу сутаргамі бясьсільнага плачу. Я спрабавала ратаваць дзіцё. Было аднак позна. Славік не рэагаваў на мае пяшчоты, быў пакананы тым пеклам, якое дзяліў са сваёй маці.

6 чэрвеня1951 года памёр мой сынок і як на зьдзек загадалі пахаваць яго на праўдзівых могілках, дзе хавалі «вольных», каб гэтым чынам даць довад, што ён не лічыўся «ЗК», і каб не пабольшаваць статыстыкі лягернай сьмяротнасьці. Мне адмовілі ўдзел у паховінах, лішылі права быць хоць-бы сьведкам адданьня чужой зямлі таго, што было маім жыцьцём, надзеяй, радасьцю, часткаю самой сябе.Магілу адзначыла бесканвойная жанчына, што паставіла на ёй крыж з напісам імя і дату паховін. Пасьля сьмерці Сталіна добразычлівы, засланы ў Казахстан зямляк уладзіў магілку і паставіў жалезны крыж.

(Заканчэньне ў наступным нумары)



Славік Катковіч

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

ЗЎКІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Аб галоўных прычынах крызысу сельскай гаспадаркі ў Беларусі

І. Нікітчанка

Зразумела, што вывесьці аграрнаіндустрыяльны комплекс з крызісу немажліва, калі няма ўрадавай праграмы, канкрэтных дзеяньняў і актыўнай падтрымкі ў законадаўчых органаў. Аграрная праграма павінна быць часткаю той агульнай эканамічнай рэформы, якую ўлады павінны распрацаваць. А якую-ж праграму ўлады павінны распрацаваць?

Першае і галоўнае пытаньне, гэта пытаньне ўласнасьці і права ўладаньня вытворчасьцю, менавіта, права на ўладаньне зямлёй і яе прадуктам. Наш уласны досьлед паказаў, што пазбаўленьне вытворцы ўладаньня сродкамі ягонай вытворчасьці ніколі не садзейнічала разьвіцьцю нармальных прадуктыўных адносін. Дзеля гэтага неабходна ў даволі хуткім часе ўнесьці карэктывы ў закон аб уласнасьці, менавіта права на ўладаньне зямлёй як прыватнай уласнасьцю без якіх колечы абмежаваньняў. Адначасна распрацаваць мэханізм перадачы селяніну (калгасьніку) на прыватнае ўладаньне сродкаў ягонай вытворчасьці. Пры гэтым павінна быць апрацавана эфэктыўнае законадаўства, якое-б абараняла сельскага вытворцу, як гэта ёсьць у ва ўсіх дзяржавах сьвету.

Другая ўмова—даць поўную свабоду вытворцы выбіраць і пастанаўляць аб сваёй вытворчасьці і мэтадах арганізацыі працы. Неабходна працэс гэты абараніць законам, каб некампэтэнтныя асобы і чыноўнікі не маглі-б ўмешвацца ў працэс вядзеньня гаспадарак. На сёньняшні дзень ўсё ўзята ў такія рамкі, што нават арганізаваць дабраахвотныя аб'яднаньні, прыкладам акцыённае, ня ёсьць магчымым.

Варта затрымацца на бюджэтна-фінансавай сыстэме. Усім, акрамя ўраду, вядома, якую жахлівую падатковую сыстэму мы маем. Сёньня ў вытворцы пасьля выплаты падатку застаецца 13,5% даходу. Пры сучасных падатках і цэнах, гаспадар на 20 га гаспадарцы павінен рэалізаваць прадукцыю ў 150 000 000 рублёў. Каб купіць запраўку для трактара трэба прадаць 3 тоны жыта, 2,5 тоны пшаніцы або 5.1 тоны бульбы

Другая негатыўная старана сучаснай падатковай сыстэмы—правакацыя роста цэнаў. Калі ўлічыць усе абавязковыя ападаткаваньні і плацежы, цэна павінна быць большая ад затратаў у 3 разы. З кожнай перапрадажай прадукта цана падваеваецца, нават патраеваецца. Зразумела, што такая падаткавая сістэма нерэальная і яе трэба скасаваць.

Патрабуе радыкальнае перабудовы сыстэма кіраваньня. Няма ніякай неабходнасьці атрасьлявых кіраваньняў у Савеце Міністраў і аналягічных міністэрстваў, таксама розных дзяржаўных канцэрнаў, аб'яднаньняў, асацыяцыяў. Неэканамічна мець апарат для гаспадарак: сельскай, лясной, рыбнай і г.д.

Неабходна адмовіцца ад Саветаў, як формы мясцовага самакіраваньня. Гэтыя Саветы ёсьць органы калектыўнай безат-

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

казнасьці і пераважна ўзначальваюцца некампэтэнтнымі асобамі, якія прывыклі ігнараваць законы. Саветы даўно зжылі сябе , сталі яўным тормазам любых рэформаў на вёсцы. Заміж Саветаў больш мэтазгодна перайсьці да муніцыпальнага кіраўніцтва як гэта ёсьць у шматлікіх дзяржавах. Натуральна, што сучасную выбарчую практыку трэба скасаваць. Кіраўнікоў і сябраў управаў патрэбна выбіраць тайным галасаваньнем з удзелам усіх выбаршчыкаў. Дарэчы, такім-жа мэтадам трэба перабраць усіх бяз вынятку кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў.

Акрамя структурнай перабудовы пажадана каардынальна зьмяніць функцыі ворганаў мясцовага самакіраваньня. Яны не павінны займацца кіраваньнем вытворчасьці. Іх галоўнай мэтай павінна быць забясьпечыць дзейнасьць законаў Рэспублікі Беларусь, забясьпечыць грамадзян сацыяльнай абаронай, арганізаваць камунальныя паслугі, складаць мясцовы бюджэт.

Узьнікае пытаньне, а хто мусіць увесьці ў жыцьцё ўсе гэтыя прапановы? Урад? Вярхоўны Савет? Мы дастаткова пераканаліся, што сучасныя законадаўчыя і выканаўчыя ворганы няздольныя правесьці каардынальныя зьмены ў аграрным сэктары. Бальшыня сяброў Ураду і Вярхоўнага Савету не валодае адпаведнымі ведамі ў аграрным пытаньні.Ці здольныя такія асобы распрацоўваць аграрныя рэформы? Адсутнасьць адпаведных ведаў толькі павялічвае усеагульную безадказнасьць кіраўніцтва рэспублікі й атрымліваецца кругавая парука.

Прыскораныя выбары Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь павінны прынесьці палёгку аграрнаму сэктару. Але гэтае станецца толькі тады, калі людзі выбяруць дэпутатаў, якія будуць дбаць аб сельскай гаспадарцы.

Давід-Гарадок. На базары. На першым пляне: саматужнік-ганчар прадае свае вырабы. Фота Ул. Сухапара. ліпень 1992

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012

ПЯЦАК
КІНЯЛЕНД ЭШЫ ЧАСОПІС

© PDF: Kamunikat.org 2012

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Із агню ды ў полымя

Міхась Кавыль

Быліца чатырнаццатая

Мінула студзёная зіма. Паўстала пара, калі ня трэба было думаць пра цёплую вопратку, пра зямлянку. Аляксей Новік задаволена пазіраў на сіняе неба, што прасьвечвала праз вяршаліны хвояў і ялінаў. Часам чуліся курлыкі журавоў, што вярталіся з выраю, і сваім курлыканьнем наганялі хандру. Хандрылася Аляксею ня толькі ад курлыканьня, а і таму, што за амаль два гады ён прабадзяўся навокал Менску, а нічога значнага не сатварыў. Праўда, перадаў у Маскву шмат карысных вестак, але, апрача ўзрыву казіно, пахваліцца няма чым. І вось прыпомніў, што Маня Вярбіцкая казала Клашы пра нейкага Сэляха, які рыхтуе да пастноўкі ў БДТ- п'есу Тодара Лебяды «Загубленае жыцьцё». Маня на рэпэтыцыях ня была ні разу, пра што тая п'еса ня ведала. «Здраднік Сэлях можа выраблять толькі такога-ж здрадніка, як сам», — думаў Новік, а таму рашыў дзейнічаць.

Паклікаўшы да сябе Маню, якая сядзела пад кусьцікам з сваім Лявончыкам, Аляксей сказаў: «Вось што, красавіца. Ты сягоньня мусіш пайсьці ў Менск. Пастарайся разьведаць добра, ці можна падкласьці міну пад ложу, дзе будуць сядзець у час сьпяктакля вялікія «шышкі».Маня сказала: «Добра, але сягоньня я не змагу пайсьці, бо сёньня нядзеля, у тэатры можа быць рэпэтыцыя і мяне могуць забачыць артысты. Гэта адно. Другое. Сёньня мой брат Яраслаў у лес па дровы для немцаў ня прыедзе, а толькі заўтра альбо ў пятніцу. У гэтыя толькі дні ён робіць рэйсы ў лес. А яшчэ брат ня хоча мяне браць у машыну, бо баіцца, каб немцы не абыскалі машыну на заставе. Ён звычайна запіхвае мяне сабе пад ногі. Немцы яго ведаюць. Машыну не абшарваюць, Яраслаў толькі паказвае ім праз вакно «асвайс» і праяжджае. Ды брат баіцца. Сказаў, што болей мяне ня возьме»

—Нічога, Манюня. Мы яго заставім ня баяцца. Заўтра раненька пойдзеш на спатканьне з братам у суправодзе Лявончыка, які цырымоніцца зь Яраславам ня будзе. Ідзі і скажы Лявончыку. Хаця не, я сам скажу. Мне трэба пайсьці ў «агульную» (шалаш).

Маня пайшла да дзяўчат, якія рыхтавалі вячэру, а Новік у шалаш, каб назначыць людзей на «аэрадром» (невялікую палянку ў сасонкі) для нарыхтоўкі ламачча для кастра, які яны пад камандай Барыса Сечкіна мусяць запаліць уночы—даць сыгнал самалёту, які маецца прыляцець з прадуктамі і зборыў. Клаша бачыла ,як Аляксей гутарыў з Маняй, у ёй не падабалася, што Аляксей заігрывае зь дзяўчатамі. Хаця яна пераконвала сябе, што Аляксей для яе «ноль бяз палачкі» , але ён усё болей рабіўся для яе палачкай бяз нуля, прыцягваў яе фізычна. Яна адчула цяплыню яго цела і не знайшла розьніцы паміж ім і Язэпам. Раней Язэп не выходзіў у яе із галавы. Ня думала пра яго толькі тады ,калі засынала. Ды і то часта ён ёй сьніўся. Першы раз як прызямліліся каля Менску ,радая была, што апынулася

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

на зямлі каханага чалавека .Блукаючы па лясох Беларусі, прыслухоўвалася да шуму дрэў, шчабятаньня птушак. У тым рознагалосым хоры чуўся знаёмы напеўны голас Язэпа:

«Дан приказ ему на Запад.

Ей в другую сторону».

«Памяняліся мы зь ім напрамкамі, —думала Клаша.—Ён паехаў у «другую сторону», а я «на Запад». Павярнулі ўжо нашы ад Масквы, ідуць на Запад. Можа, і Язэп ідзе. Можа спаткаемся яшчэ». Але амаль два гады партызаншчыны, холаду,голаду, а вось нядаўна ўцёкі і хаваньне за карчамі і дрэвамі ад посьвісту куляў беларускіх паліцаяў, выбілі із галавы Клашы рамантычныя мары, раззлавалі нават на Язэпа за тое, што ён беларус. Ад куляў беларусаў яна ледзь не разьвіталася з жыцьцём. А яна-ж у такім веку, калі толькі думаецца пра вусны, пра.. І рашыла Клаша паставіць крыжык на кляцьбе, дадзенай Язэпу, і браць ад жыцьця ўсё, што можна. Яна ўжо не чакала, калі Аляксей пойдзе зь ею разьвешваць антэну, а сама стала наведвацца да яго ў шалаш, калі Сечкін адпраўляўся на заданьне.

Новік падыйшоў не адізн, а з незнаёмым хлопцам, блындынам, высокім, стройным, у нейкай цікавай, блакітна-бурай уніформе. «А гэта яшчэ што за дэсантнік зьявіўся?—зьдзівіла Клашу нязвычайная ўніформа незнаёмага «марсіяніна», як Клаша ахрысьціліа Васіля Васільявіча Васілеўскага. А гэта быў ён, Новік сказаў Клашы: «Пайшлі ў штаб, будзеш пісаць пратакол». Яны зайшлі ў вялікаваты шалаш, ці-ж бо прагаліну паміж густога арэшніку, дзе замест стала— шырокі сьвежы пень, замест лаўка ў ды табурэтка—хваёвыя круглякі, замест ложка — альле бярозы й арэшніку.

Клаша прысела за «стол». Новік дастаў і з партфэля паперу й алавік, даў Клашы і зьвярнуўся да Васіля:

—Як твая фамілія, імя і па бацьку?

—Васілеўскі Васіль Васільявіч.

—Дата і мейсца нараджэньня?

—Першага кастрычніка 1915 году, Ленінград, а тады быў Пецярбург.

—Хто ты па нацыянальнасьці?

—Рускі.

—Акружэнец?

—Да, так.

—Быў у «прымах» у Менску?

—Не понімаю, не разумею вопроса.

—Дзе знаходзіўся пасьля акружэньня?

—В плену.. палоне...

—Уцёк із «плена».

—Не ніхт.. Белорусы освободили...

— І ты прыехаў у Менск з групай прапагандыстых?

—Да, так.

—Рускі, а стаў беларускім нацыяналістам?Ды, як-жа цябе, маскаля, фашыст Акіньчыц прыняў у сваю банду?

—Мой друг Язэп Лабач памог: сказаў Акіньчыцу, што я беларус, але радзіўся ў Сібіры, куда былі высланы мае родители, што школ белорусских там не было. І мяне прынялі.

Толькі цяпер Новік адарваў свае вочы ад Васіля і зірнуў на Клашу. Яна ня пісала, а сядзела, зьбялеўшая, паклаўшы на паперу рукі. Гэта вестка пра Язэпа Лабача пра яе агаломшыла. Новік ведаў пра яе раман зь «ненадзейным элямэнтам», ведаў яшчэ ў Варонежы. Пачутае ад Васіля яго таксама насьцярожыла, бо «неўраўнавешаная», як ён называў пра сябе Клашу, магла натварыць неабдуманых выбрыкаў, а таму Новік грубавата аклікнуў яе:

—А ты што нос павесіла? Пішы, бо мне няма часу патураць тваім бзыкам.

Клаша злосна зірнула на Новіка і нахілілася над сталом. Новік да Васіля:

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

на зямлі каханага чалавека .Блукаючы па лясох Беларусі, прыслухоўвалася да шуму дрэў, шчабятаньня птушак. У тым рознагалосым хоры чуўся знаёмы напеўны голас Язэпа:

«Дан приказ ему на Запад.

Ей в другую сторону».

«Памяняліся мы зь ім напрамкамі, —думала Клаша.—Ён паехаў у «другую сторону», а я «на Запад». Павярнулі ўжо нашы ад Масквы, ідуць на Запад. Можа, і Язэп ідзе. Можа спаткаемся яшчэ». Але амаль два гады партызаншчыны, холаду,голаду, а вось нядаўна ўцёкі і хаваньне за карчамі і дрэвамі ад посьвісту куляў беларускіх паліцаяў, выбілі із галавы Клашы рамантычныя мары, раззлавалі нават на Язэпа за тое, што ён беларус. Ад куляў беларусаў яна ледзь не разьвіталася з жыцьцём. А яна-ж у такім веку, калі толькі думаецца пра вусны, пра.. І рашыла Клаша паставіць крыжык на кляцьбе, дадзенай Язэпу, і браць ад жыцьця ўсё, што можна. Яна ўжо не чакала, калі Аляксей пойдзе зь ею разьвешваць антэну, а сама стала наведвацца да яго ў шалаш, калі Сечкін адпраўляўся на заданьне.

Новік падыйшоў не адізн, а з незнаёмым хлопцам, блындынам, высокім, стройным, у нейкай цікавай, блакітна-бурай уніформе. «А гэта яшчэ што за дэсантнік зьявіўся?—зьдзівіла Клашу нязвычайная ўніформа незнаёмага «марсіяніна», як Клаша ахрысьціліа Васіля Васільявіча Васілеўскага. А гэта быў ён, Новік сказаў Клашы: «Пайшлі ў штаб, будзеш пісаць пратакол». Яны зайшлі ў вялікаваты шалаш, ці-ж бо прагаліну паміж густога арэшніку, дзе замест стала— шырокі сьвежы пень, замест лаўка ў ды табурэтка—хваёвыя круглякі, замест ложка — альле бярозы й арэшніку.

Клаша прысела за «стол». Новік дастаў і з партфэля паперу й алавік, даў Клашы і зьвярнуўся да Васіля:

—Як твая фамілія, імя і па бацьку?

—Васілеўскі Васіль Васільявіч.

—Дата і мейсца нараджэньня?

—Першага кастрычніка 1915 году, Ленінград, а тады быў Пецярбург.

—Хто ты па нацыянальнасьці?

—Рускі.

—Акружэнец?

—Да, так.

—Быў у «прымах» у Менску?

—Не понімаю, не разумею вопроса.

—Дзе знаходзіўся пасьля акружэньня?

—В плену.. палоне...

—Уцёк із «плена».

—Не ніхт.. Белорусы освободили...

— І ты прыехаў у Менск з групай прапагандыстых?

—Да, так.

—Рускі, а стаў беларускім нацыяналістам?Ды, як-жа цябе, маскаля, фашыст Акіньчыц прыняў у сваю банду?

—Мой друг Язэп Лабач памог: сказаў Акіньчыцу, што я беларус, але радзіўся ў Сібіры, куда былі высланы мае родители, што школ белорусских там не было. І мяне прынялі.

Толькі цяпер Новік адарваў свае вочы ад Васіля і зірнуў на Клашу. Яна ня пісала, а сядзела, зьбялеўшая, паклаўшы на паперу рукі. Гэта вестка пра Язэпа Лабача пра яе агаломшыла. Новік ведаў пра яе раман зь «ненадзейным элямэнтам», ведаў яшчэ ў Варонежы. Пачутае ад Васіля яго таксама насьцярожыла, бо «неўраўнавешаная», як ён называў пра сябе Клашу, магла натварыць неабдуманых выбрыкаў, а таму Новік грубавата аклікнуў яе:

—А ты што нос павесіла? Пішы, бо мне няма часу патураць тваім бзыкам.

Клаша злосна зірнула на Новіка і нахілілася над сталом. Новік да Васіля:

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Клаша, уздыхнуўшы:

—Знаёмая. Вельмі добра знаёмая. Хацела-б пабачыцца зь ім, але.

—А можа, хутка і пабачыцеся. Я сягоньня пад дыктоўку таварыша Новіка напісаў яму пісьмо, каб ішоў у партызаны.

Клаша ажно скалахнулася ад пачутага і прагаварылся з гарачкі.

—О, гэтага я не дапушчу, не дапушчу! Яго-ж расстраляюць. І цябе...

Яна асеклася і заплакала, а тады ізноў:

— Ты ня бойся. Я пагавару з начальнікам, цябе не расстраляюць. Але,як зрабіць, каб Язэп ня ішоў сюды?

Клаша заўважыла Маню, што вярталася із штаба. Калі тая падыйшла, Клаша падхапілася, адвяла яе недалёка ад Васіля і насела сваім аўтарытэтам«франтавое жонкі»: «Што ты рабіла з начальнікам у штабе? Качалася на саломе? Кажы мне, як на споведзі.

Маня спалоханалася, залепятала:

—Да што, ты, таварыш Клаша. Я атрымала толькі яшчэ адно заданьне.

—Якое?

—А вось гэтае пісьмо. Я мушу заўтра аднесьці яго Язэпу Лабачу. Больш нічога.

—А ня ведаеш, што там пішацца?

—Ня ведаю, чытаць ня маю права.

—Я ведаю. Твайго сваяка таварыш Новік кліча ў лес, каб яго зьнішчыць. Кумекаеш? Калі ты яго шкадуеш, скажы, каб ня йшоў.

Маня ня ведала, як быць, але, нарэшце, прамямліла: «Пастараюся».

Клаша яшчэ прыстрашыла Маню:

—Калі ня скажаш і данясеш Новіку пра маё заданьне, не вяртайся назад, бо пазнаёмішся вось з гэтай штучкай. І Клаша падкінула ў руцэ свой наганчык.

(Працяг будзе)

Р.Кудрэвіч. Вясна. 1945.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Ваўкалак

Марат Баскін

Што за маластовец без каня? У кожнага маластоўца конь ёсьць. Вараныя ды булавыя, гнядыя ды пярэстыя, грывамі трасуць, падковамі іскры выбіваюць. Толькі ў Андрэя-пастуха няма свайго каня. З раніцы да вечара, з вечара да раніцы чужых коней даглядае. Лепшага пастуха, чым Андрэй, не знайсьці: кожнага каня ведае, з кожным канём, як з чалвекам, размаўляе. Не нарадуюцца маластоўцы, што такога пастуха заімелі. Коні самі з двара бягуць, як дудку Андрэя пачуюць .Хоць і малы хлопец, а ўсе да яго з павагаю: любога каня аб'езьдзіць, першым у брычку запражэ, конь пад ім бы ў цыркача, танцуе. А як на дудцы пачнуць пастухі граць, роўню Андрэю не адшукаць.

Задаволены маластоўцы сваім пастухом

—Хоць і сірата, а хлеб ніколі не прасіў, сам зарабіў, —мужыкі кажуць.

—Сястрычку ў наймічкі не аддаў, сам выхадзіў, —бабы хваляць.

Аднаму Язэпу пастух не да спадобы: ці за тое, што Андрэй яго коней са статку не вылучае, як усіх глядзіць, ці то за тое, што сястрычку сваю Андрэй да Язэпа ў наймічку не пусьціў.

Як пачуе Язэп, што добрае пра Андрэя, у твары зьменіцца: сала яшчэ не сала, пакуль на сьвіньні бегае, яшчэ з пастухом бяды набярэцеся, бурчыць.

Доўга так казаў ці не, ды бяду на пастуха наклікаў. Павадзіўся ў статак канакрад: чатырох каней украў. Пад воўчай шкурай твар схаваў, воўчымі сьцежкамі ад пагоні ўцёк.

Сабраліся мужыкі, пачалі радзіцца, як ад злодзея коней зьберагчы.

—Аднаму пастуху з канакрадам не справіцца, —Ягор сказаў.

—Канакрад на гэтым не спыніцца, —Мацей дадаў.

—А як, яго, канакрада, адшукаеш, калі можа, сам пастух тых коней крадзе. — Язэп у размову ўлез.

—Няма з чаго на хлопца напрасьліну ўзводзіць,—Янка за пастуха заступіўся.— Лепш давайце па чарзе статак з пастухом вартаваць, хутчэй зловім злодзея!

Як прапанаваў Янка, гэтак і парашылі маластоўцы. Ды канакрад бы на радзе той быў: заціх, каб у пастку не трапіць: па два разы маластоўцы адвартавалі, ды злодзея не злавілі.

—Можа ён куды далей падаўся? —Сьцяпан выказаў здагадку.

—Была бяда, з дажджом сплыла.— Янка пагадзіўся.

І Язэп слова ўставіў:

—Калі самім вартаваць, навошта пастуха трымаць. А калі ізноў злодзей пачне красьці, значыць, у хаўрусьніках у яго пастух! Хутка кірмаш у Прапойску.Пэўна, туды нашых коней пагоняць. Маё слова памяніце: ён канакрад!

Вочы за ноч не заплюшчыў Андрэй, а на сьвітаньні каней пералічыў, аднаго не далічыўся —язэпава.

—Зноў ад злодзея статак не зьбярог, як мужыкам у твар пагляджу, на сэрцы ў пастуха кошкі скрабуць, а што зрабіць ня ведае.

—Сам пайду да Язэпа ў парабкі, а за каня адраблю! Пэўна, пастухом мне больш ня быць,— сам сабе Андрэй кажа. — Пакуль за коней мужыкам грошы не вярну, не змагу жыць спакойна.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Апусьціў галаву Андрэй, вочы рукамі закрыў, каб коні сьлязу ня ўбачылі.

—Гэй, пастушок, —раптам чуе Андрэй, што гукае яго нехта. Чаго галаву апусьціў, на дудцы ня граеш? Ці сон змарыў, ці бяда якая асіліла?

Азірнуўся хлопец, глядзіць, стаіць насупроць яго мужычок,з выгляду як усе маластоўцы, толькі гэткі малы, што на далоні ляжа, яшчэ месца застанецца, кій падарожны ў руцэ, капялюш саламяны на галаве, торба за плячыма.

—Бяда,—Андрэй прызнаўся. Злодзей павардзіўся ў статак. Сёньня зноў каня украў. Як я мужыкам у твар пагляджу, што я ім цяпер скажу? Не да дудкі мне дзядуля!

—Гэта бяда не бяда—мужычок кажа, —галаву да нізу не хілі, нос ня зьвешвай! Знойдзем мы на злодзея ўправу! Калі злодзей да статку ваўком краўся, ваўком ён і застанецца! Так маластоўцам і перадай! А коні ў лагчыне стаяць, не пасьпеў іх канакрад далей перагнаць! Зьбіраўся перад кірмашом да цябе ў двор іх завесьці, каб паклёп на цябе ўзьвясьці!

—Хто-ж, злодзей гэты?—Андрэй аж кулакі сьціснуў, з травы падняўся.

—Сам даведаешся,нядоўга чакаць!—Мужычок усьміхнуўся.—Перадай ад мяне маластоўцам, што я надоўга ў іншыя краі падаўся. Шмат Маластовак на белым сьвеце, у кожнай пабываць трэба, усюды мяне чакаюць! —мужычок вус падкруціў, капялюш на галаве паправіў, вось-вось зьнікне, ды раптам схамянуўся на Андрэя паглядзеў —А ці ведаеш, хлопча, ад каго прывітаньне маластоўцам перадаць?

—Як-жа ня ведаць,—пастух кажа.—Ад Малога Маластоўца! Вас, дзядуля, кожны ў Маластоўцы ведае: хто хоць на свае вочы ня бачыў, то чуць абавязкова чуў!

—Ну, то добра, сынок, —мужычок узрадаваўся. Перадай усім: ад бяды не згінацца трэба, а зь бядой змагацца трэба! Дужае зло, а дабро мацьней! Сказаў гэтак мужычок, кійком узмахнуў і зьнік, быццам і не было яго.

З таго разу болей яго ў Маластоўцы не бачылі.

Знайшлі маластоўцы сваіх коней у лагчыне, тут толькі і заўважылі, што Язэпа зь імі няма: конь стаіць, а гаспадар быццам і не шукае яго. Падзівіліся маластоўцы, не падобна гэта на Язэпа, каб за сваім дабром першы не прыбег. Узялі каня ды да Язэпа гуртам падаліся.

У Язэпіхі спыталі пра гаспадара, а яна ў адказ толькі моўчкі на хлеў паказала. Расчынілі дзверы ў хлеў мужыкі ды назад ад нечаканасьці падаліся: воўк у кутку стаіць, вачамі блішчыць, зубамі ляскае. Разгубіліся мужыкі, а воўк тым часам у дзьверы сігануў ды праз плот скокнуў, у лес падаўся.

Доўга яшчэ пасьля таго ўночы да дому прыбягаў. Стане перад ганкам ды вые, бы дабро сваё аплаквае. Але ўзімку зьнік кудысьці, ці то паляўнічыя прыстралілі, ці то ў іншы лес падаўся.

Перадаў Андрэй наказ Малога Маластоўца Маластоўцам.

Пасьля той сустрэчы шмат гадоў Малога Маластоўца ў Маластоўцы не сустракалі.

Толькі пра яго не забыліся. Толькі хто нос кверху задзярэ, не па-людзку жыць пачне, адразу яму пра Малога Маластоўца напамінаюць:

—Глядзе ня ўверх, а то носам аблокі зачэпіш, глядзі ўніз —Малога Маластоўца ўбачыш! Можа паразумееш тады!

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

Лісты і вершы Уладзіміра Караткевіча

1959 г.

Здорово, милай ты мой однокашник и земляк!

В благодарность за твоё долгое молчание посылю тебе тот гроб, что на обороте. Он хоть и майоликовый, но вполне пригодный. Как видишь, у меня, забытого, прорезался юмор висельника...

Да будет тебе известно, братишка, что я ныне в Москве, учусь на Высших литературных курсах при институте им. Горького и кончил ужо один курс полным отличником и пай-мальчиком. Посьле курсов, которых век бы не кончал, ибо платят 1,5 тыс. стипендии, не требуют работы и предоставляют отдельную комнату, воспитывая, таким образом, паразиты, думаю подаваться в Минск.

Адрес мой с 1-го сентября Москва К-104

Тверский бульвар 25

ВЛК

Мне

Впрочем, насчет безделья я шучу. За год строганул полсотни стихов и с десяток рассказов.

Живу хорошо, очень многое вижу, познакомился с интереснейшими людьми. Будешь мне писать-узнаешь много интересного.

Будь человеком и не замыкайся в стенах «Гигмотоподземгаза», из одного этого окружения ничего путного не получится.

Успехи даются трудно. Пока только в «Знамя» №3 за этот год перевели да будет подборка в №8 или 9 «Молодой гвардии». Займусь ка я сам переводом рассказов и устроением их в журналы, вернее будет. Юрку не видел. Он спился и исчез не предупредив меня. Смертельно жаль человека. Лешку видел в Минске с год назад. Он в аспирантуре и благоденствует. Заезжай в Оршу, когда будешь в Белоруссии.Как Муза и дочушка? В графе «сем. пол» пишу попрежнему карандашом и вообще, сердце моё представляет собою хоть и красивые, но несомненные развалины (смотри на обороте). Любовий было много, а настоящая пришла только для крайних и довольно страшных мучений: полюбил замужнюю и, боюсь, надолго. Везёт же мне. Но лучше уж никого, если её не будет. Достаточно я насмотрелся на кукольные головки, болтающие вздор и чепуху. Оно с неделю и хорошо, да только потом больно противно. Только и умеют, что напиться на «междусобойчике». И целовать их гадко, как рыбу из стоячего пруда.

А настоящее досталось другому. И, кажется, невесело ей, бедной, с другим. Когда я уверюсь в этом-разобью их сем'ю без сожаления, зубами драться буду. Ты же меня знаешь: и нежным быть могу, и терпеливым, если полюблю.

Ну вот и всё старик. Ты всё-таки не очень радуйся по поводу приобретённой тахты, будь лучше тем честным, и, иногда, препаршивым парнем, с которым мы ругались и которого любили.

Твой Владидмир.

10 июля 59 г.

Салям великим маховикам энергетики!

Не буду я вам больше саркофагов посылать, вот что. Недостойны вы их, а достойны жизни и сверкания солнечного. Продолжай, братец, ругаться с киоскёршей

Заканчэньне.

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

и далее, ибо в №7 «Нового мира» есть переводец еще одного моего вирша. А насчёт перевода «Партизанской баллады», так он мне не понравился, не то. Автор настойчиво старался снять всякий налёт мистики. Как то «Перад тым як вочы жанчыны заснаваў Невядомага дым», «пакінула гэту турму, и мужчына ад плачу затросся, як яна дваццаць год таму». Вместо этого оставлены некие недоноски. А ты ещё остришь о «величайшем поэте» .Тоже, сволочь, — с иронией!

Жаль что книги достать уже нельзя ни в Орше. ни в Минске. Но я попытаюсь раздобыть один экземпляр (веришь, и у меня нет), и выслать тебе.

Насчёт несчастных любовей ты не сумневайся, касатик. У меня они сейчас значительно счастливее, чем в годы молодые, Мне дьявольски начало вести, но я, как тебе известно, сторонник экзотики (приготовься: сейчас начну говорить гадости), и поэтому непременно вляпаюсь в историю: не в старшую влюблюсь, так в узбечку, не в оную, так з замужнюю. И потому некоторые удары по нервам всегда будут сопровождать мой жизненный путь.

А Байрона я в плавании непременно перекрою когда-нибудь. Переплыву, скажем, не Геллеспонт, а озеро Нарочь. Или Ладожское. Оно шире. Это нетрудно. Старые атлеты были, как ни странно, слабее .Тольки один рекорд не превзойдён, рекорд Милона, который проткнул пальцем зелёное яблоко, с маху.

А насчёт Юрки можно сказать почти точно, от чего это всё получилось. Помоему, это от унизительного бессилия многих людей перед временем. Вспомни-ка 1947-1953 годы. А он был нервен, как женщина, ещё с детской кроватки, когда родных арестовали в 37-м.

У кого были нервы покрепче-тот вынес. А остальные надломались, да так и привяли,

Юнну Мориц я лично не знаю, но много о ней слыхал. Киевлянка, прекасный поэт. У меня есть ее книжка, —нравится.

С ней случилась в институте какая-то гадость. У них, в отличие от курсков, всем заправляют толсточерепные зубры и мастодонты —так она прицепились к девке, за какой-то пустяк и исключили. Сейчас, кажется, снова приняли, невзирая на вопли свиней. Точно, впрочем, не знаю.

И какое кому дело до того, как живёт человек, — до сих пор не понимаю. Ахмадулина, жена Евтушенки Евгения, талантливая баба, хоть малость и с чудинкой. Выгнали. Самого Женьку (а он талантище, хоть малость и претенциозный), выгнали. Э-эх,людие, братия наша-во Христе, Будде, Иегове, Магомете и черт знает ещё в ком. Скверно они ведут себя. Можно, в соответствии с «Островом доктора Моро» подумать, что всё человечество, за малым исключением, состоит из «гиеносвиней».

Ну да дьявол с ними.

Музе привет.

Пишите.

Владимир.

P.S. А Минск через пару лет будет лучше Киева.

25. XII. 59.

Дорогие Лёня и Муза!

Извините за долгое молчание. Очень занят был «Площадью Маяковского» (продолжением). И, конечно же, я большая свинья, что не выслал до сих про книги. Sonfiteor!!! Исправляю грех. Только не иронизируйте.

Поздравляю с Новым годом. Желаю всего, чего желают очень дорогим людям. Как у вас дела, как доця. Юнка мне что-то не очень нравится. Малость заносчива, помоему. Я первый пошёл на знакомство (ша-

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

почное), но она держалась так сухо, что я сейчас немного жалею об этом. В институте идёт ругня между старыми и молодыми. Я стою на позиции, что старые зазнались, а молодые —зарвались.

Я сейчас написал продолжение «Площади» уже не только в минорных, но и в отчаянных тонах (поэма «Грубае и ласкавае»), но сейчас буду писать третью часть трилогии, радостную и ликующую (название —«Снежаньскія ружы»). Так что вот. Буду до 1 янв. здесь, а потом, до 10 февраля, в Орше. Пишите. Целую.

Владимир.

5 мая 66 г.

Дорогой Леонид!

Сто лет не писал тебе. Ерунда какая-то получается. Думаешь часто, а минуту выбрать, чтобы засесть за письма никак не удаётся. Слишком много работы и всякой такой прочей текучки. Тут уж извини, да и Музу попроси извинить. Она женщина, она—простит. Да и тебя уговорит тоже.

Рад, что «Каласы» тебе понравились. Третьей части в этом году в «Полымі» не будет, разве что в следующем. Я тебе тогда напишу, да и рекламу вышлю. Рекламам, много не завереным, не верь.

Как у вас дела, милые старики? Как работа, семья, здоровье, как быт устраивается? Хоть изрека черканите пару слов. Заинтересованность наша друг в дурге слишком давняя, чтоб терять хоть одного из друзей прежних лет. И без того их не так ужо и много.

